АБАРАНКІ Ў ХАЦЕ, ЗНАЧЫЦЬ БУДЗЕ СВЯТА 8

БЕЛАРУСЫ ТАКСАМА ХОЧУЦЬ МЕЦЬ «ОСКАР» 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 СНЕЖНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 239 (29353)

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ІСАЧАНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі:

«Мы практыкуем розныя фарматы ўзаемадзеяння з нашымі грамадзянамі: прамыя тэлефонныя лініі, прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях у Савеце Рэспублікі, а таксама выязныя прыёмы. Улада адкрытая, мы чуем кожнага і гатовыя дапамагаць усім, каму гэта неабходна, таму стараемся ўсялякім чынам пашыраць каналы камунікацыі і выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі ў гэтым важным пытанні».

КАРАТКА

- **Беларуская чыгунка захавала на 2021 год сёлетнія тарыфы на транзітныя перавозкі грузаў у вагонах і кантэйнерах.**
- Сацыяльна-асветніцкая ўстанова «УНОВІС-Форум» (Віцебск) і Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт абвясцілі міжнародны конкурс «Арт-эскіз. УНОВІС 100».
- **Магістрант юрыдычнага факультэта БДУ Аляксандр Афанасьеў увайшоў у лік найлепшых маладых навукоўцаў СНД 2020 года.**
- Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў за 2020 год выпусціла ў 24 вадаёмы больш за 30 тон рыбы.
- **Арсенал Гродзенскай рэгіянальнай мытні папоўнілі сістэма відэадакументавання і партатыўныя радыёстанцыі.**

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Зніжэнне дасягнутага ўзроўню непрымальнае»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з урадам, вышэйшымі службовымі асобамі і кіраўнікамі рэгіёнаў эканамічны прагноз на будучы год.
Учора ў Палацы Незалежнасці адбылося «бюджэтнае» пасяджэнне ў пашыраным складзе. Беларускі лідар адразу растлумачыў — чаму. Падыходы, якія прапанаваў урад і Нацыянальны банк, пажадана зверыць найперш за ўсё з запытамі мясцовых органаў улады.

Фота БелТА.

ПАДЗЕЛ АДКАЗНАСЦІ

«Калі ўрад і парламент пры разглядзе гэтых дакументаў, што будуць фармалізаваныя ў законах і ўказах Прэзідэнта, вырашаць, што мае перавагу для развіцця нашай краіны, і гэта будзе задавальняць запатрабаванні мясцовых органаў улады ў асобе губернатараў, значыць так і будзе», — падкрэсліў ён.

Традыцыйна бюджэтны пакет распрацоўваецца ўрадам з удзелам парламентарыяў. Акрамя таго, 2 снежня прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка прадстаўляў у Авальнай зале ніжняй палаты праект праграмы дзейнасці ўрада на сяроднетэрміновую перспектыву. Пасля абмеркавання самых важных эканамічных дакументаў краіны ў кіраўніка дзяржавы яны будуць канчаткова дапрацаваныя і прынятыя ў выглядзе законаў або ўказаў — гэта што датычыцца перспектыў на год. План на пяцігодку будзе разгледжаны і прыняты на Усебеларускім народным сходзе.

СТАР. 2

Мірная візітоўка краіны

У пачатку снежня споўнілася дваццаць гадоў, як Мірскі замак — першы з архітэктурных помнікаў Беларусі — быў уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Цяпер замкавы комплекс з'яўляецца сапраўднай турыстычнай славутасцю, ён прыцягвае сваёй непаўторнай велічнасцю і гісторыяй не толькі жыхароў краіны, але і шматлікіх замежных турыстаў. Дзякуючы адрэстаўраванай «жамчужыне» Беларусь успрымаюць як краіну замкаў. У летні перыяд каля яго сцен адбываюцца рыцарскія баі, праходзяць кірмашы і канцэрты вядомых артыстаў, а ўнутры замка праходзяць культуралагічныя канферэнцыі і пасяджэнні. Дырэктар замкавага комплексу Аляксандр ЛОЙКА *(на здымку)* ганарыцца, што гэты аб'ект успрымаецца як візітоўка нашай краіны, і спадзяецца, што комплекс неўзабаве атрымае званне «Нацыянальны».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Будзьце пільныя!

Сярэдні ўзрост кіберзлачынцаў знізіўся да 17 гадоў

ВІРТУАЛЬНЫЯ «ГУЛЬНІ» — РЭАЛЬНЫЯ СТРАТЫ

Эксперты папярэджваюць, кіберзлачыннасць «расперазалася» не на жарт — яна паказвае павелічэнне выпадкаў не ў асобна ўзятай краіне, а наогул тэндэнцыі ва ўсім свеце. Вялікі і імклівы рост кібератак зафіксаваны ў перыяд пандэміі, калі быў уведзены аддалены рэжым работы, адбыліся скарачэнне супрацоўнікаў і фінансавы крызіс. Толькі ў 2020 годзе колькасць зарэгістраваных злачынстваў у інтэрнэце павялічылася больш чым у два разы ў параўнанні з мінулым годам, адзначае наш суразмоўнік — эксперт і дырэктар кампаніі — правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Зніжэнне дасягнутага ўзроўню непрымальнае»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры гэтым важна пастаўленыя задачы вырашыць, звярнуў увагу Прэзідэнт. «Паўгода, 9 месяцаў, па выніках года — хто не выканаў, сыходзяць на пакой», — папярэдзіў ён пра наступствы.

Гэта непасрэдна датычыцца чаканняў пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады, акцэнтаваў беларускі лідар.

«Паўнамоцтвы мы пераразмяркуем, дададзім, каму мала, але і адказнасць пяройдзе на тых, хто атрымае гэтыя дадатковыя паўнамоцтвы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — ***У дадзеным выпадку схема самая дэмакратычная, ва ўсіх дэмакратычных дзяржавах менавіта так: урад унёс, парламент узгадніў, калі гэта закон — кіраўнік дзяржавы яго падпісвае.*** Альбо адхіляе, калі парушаюцца прынцыпы, якія вызначаныя пяць гадоў таму Усебеларускім народным сходам... Абсалютна празрыстая, прыгожая, дэмакратычная схема».

«АДЗІН З САМЫХ СКЛАДАНЫХ ПЕРЫЯДАЎ»

Год, які сыходзіць, быў цяжкі для ўсяго свету. Нягледзячы на тое, што беларуская эканоміка, у адрозненне ад іншых краін, не спынялася, яна не магла не адчуць на сабе глабальнае запавольванне дзелавой актыўнасці.

«Можна па-рознаму глядзець на вынікі работы эканомікі ў бягучым годзе. Мы не дацягваем да ўзроўню мінулага года ў прамысловасці і інвестыцыях. На 15 працэнтаў у нас прасядае экспарт, — адзначыў Прэзідэнт. — Але сёння трэба думаць шырэй і ўсвядоміць, якія надзвычайныя выклікі стаяць і чаго нам удалося пазбегнуць».

Па словах кіраўніка дзяржавы, на долю дзеючага ўрада выпаў адзін з самых складаных перыядаў за апошнія дзесяцігоддзі. Ключавым дасягненнем яго дзейнасці Аляксандр Лукашэнка назваў захаванне фінансавай стабільнасці ў банкаўскай сферы, на валютным рынку, своечасовыя выплаты па ўсіх даўгах.

«І гэта атрымалася забяспечыць на фоне жорсткіх бюджэтных рамак і галоўнага шоку года — каранавіруса. І для гэтага было зроблена ўсё магчымае», — заявіў ён.

Што датычыцца прагнозных дакументаў на 2021 год, урад, па словах Прэзідэнта, прапануе засяродзіцца на сацыяльнай стабільнасці і задачах, якія яе забяспечваюць: рост даходаў, стрымліванне цэн на сацыяльна значныя тавары, будаўніцтва жылля, кантроль узроўню беспрацоўя.

44 з 45 дзяржаўных органаў (у тым ліку і мясцовыя органы ўлады) такія падыходы падтрымліваюць. Асаблівая пазіцыя ёсць у Камітэта дзяржаўнага кантролю, паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

ЦЭНЫ ЯК ФАКТАР СТАБІЛЬНАСЦІ

Наконт стрымлівання цэн кіраўнік дзяржавы лічыць, што тут не варта абмяжоўвацца толькі сацыяльна значнымі таварамі, трэба распрацаваць раз і назаўсёды механізм стрымлівання цэн па ўсіх параметрах.

«А то атрымліваецца, што сялян мы стрымліваем (у асноўным жа гэта пытанне харчавання і адзення), а ўсім астатнім вольніца», — заўважыў ён.

Практыка кантролю за цэнаўтварэннем напрацаваная, напомніў беларускі лідар. Гэтым займаюцца і прафсаюзы, і мясцовыя Саветы, і парламент.

«Цэнаўтварэнне — вельмі важнае пытанне для насельніцтва разам з «камуналкай», цэнамі на жыллё, будаўніцтвам жылля, гэта першачарговыя пытанні парадку дня, — засяродзіў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Любое даследаванне нам паказвае, што насельніцтва гэтымі пытаннямі вельмі заклапочана. Нам на гэта трэба рэагаваць».

БЕЗ СПАСЫЛАК НА ПАНДЭМІЮ

Вяртаючыся да прагнозных дакументаў, беларускі лідар пагадзіўся, што ў цяперашняй сітуацыі наўрад ці мае сэнс будаваць занадта жорсткія планы. Разам з тым ён дакладна абазначыў: зніжэнне ўжо дасягнутага ўзроўню непрымальнае ні ў сацыяльным плане, ні ў эканамічным, ні ў палітычным.

«Спасылка на тое, што ў нас пандэмія, і што ўся эканоміка ў свеце спыненая і нам няма з кім працаваць, гандляваць — не прымаецца, — папярэдзіў Прэзідэнт. — Забудзьце пра гэта. Так, гэта фон, фон непрыемны, але мы павінны паставіць перад сабой мэты і, чаго б гэта ні каштавала, іх дасягнуць».

Пажаданне кіраўніка дзяржавы — у будучым годзе павінна быць станоўчая дынаміка па ўсіх кірунках. «Пры гэтым кожны крок у абавязковым парадку павінен адпавядаць двум патрабаванням: эканамічная эфектыўнасць і беражлівыя, уважлівыя адносіны да запытаў людзей».

ЗАНЯЦЬ УСІХ

Падчас абмеркавання задач на блізкую перспектыву Аляксандр Лукашэнка спыніўся на пытанні занятасці насельніцтва.

«Неадкладна, на мясцовым узроўні перш за ўсё — старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, заняцца працаўладкаваннем беспрацоўных, — запатрабаваў ён. — З органамі міліцыі (падключыце каго лічыце патрэбным) неадкладна паставіць на ўлік усіх дармаедаў, якія боўтаюцца, і прымусіць іх працаваць. Паўтараю гэта, як бы яно ні гучала непапулярна».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, у чым бачыць галоўную небяспеку беспрацоўя: «Сёння чалавек, які не працуе, бадзяецца, гэта не проста пратэстун на вуліцы, гэта — будучы злачынец, які падкідвае нам штодня, штотыдзень, штомесяц злачынствы. І мы выдаткоўваем вялізныя грошы для раскрыцця гэтых злачынстваў, а потым яшчэ некаторых утрымліваем у месцах не вельмі аддаленых».

«ЖЫЦЬ НА ЗАПАСАХ ДОЎГА НЕ АТРЫМАЕЦЦА»

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці ёсць неабходныя рэсурсы, каб забяспечыць сацыяльны акцэнт у прагнозных дакументах. «Тым больш што і ў пытанні эканамічнага росту значная роля адводзіцца павелічэнню ўнутранага попыту, — звярнуў ён увагу. — Гэта правільна, вядома, унутраны попыт павінны закрыць самі. Хто і як будзе яго фінансаваць? Ці не парушым мы ўстойлівасць і баланс у эканоміцы? Трэба быць акуратнымі».

Добра, калі атрымаецца захаваць існуючы ўзровень сацыяльнай абароненасці, мяркуе беларускі лідар.

Адно з пытанняў, якое паставіў на нарадзе Аляксандр Лукашэнка: наколькі «жывыя» тыя інвестыцыйныя праекты, якія запланаваны да рэалізацыі ў 2021 годзе, і як яны ўвязаны з развіццём тэрыторый і гарадоў, дзе колькасць насельніцтва больш за 80 тысяч чалавек?

«Крыху насцярожвае працэс фарміравання бюджэту. Другі год запар прапануецца планаваць яго з дэфіцытам. З аднаго боку, назапашаны значныя рэшткі прафіцыту бюджэту мінулых гадоў. З іншага — жыць на запасах доўга проста не атрымаецца. Што плануецца рабіць, каб быў парадак і ў гэтым пытанні?» — абазначыў яшчэ адзін момант кіраўнік дзяржавы.

КАЛАПС НЕ СПРАЎДЗІЎСЯ

«Беларуская эканоміка развівалася сёлета ў крайне складаных умовах, — далажыў Прэзідэнту прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. — Яна перанесла ўздзеянне некалькіх шокаў: пандэмія, праблемы з імпартам нафты і экспартам калію, зніжэнне глабальнай эканамічнай актыўнасці, крызіс попыту, няўстойлівасць на ўнутраным фінансавым рынку, ціск інфляцыйных, дэвальвацыйных чаканняў на валютны рынак, курс нацыянальнай валюты, рэсурсную базу банкаў».

У выніку ўжо ў першым квартале было зафіксавана падзенне ВУП на 0,2 %, а ў другім квартале падзенне паскорылася да 3,1 %, паведаміў кіраўнік урада.

«Міжнародныя арганізацыі прадказвалі нашай краіне і далейшае імклівае падзенне, — расказаў ён. — А пасля нестабільнасці фінансавага рынку, якая ўзнікла ў жніўні, увогуле — хуткі і абвальны калапс эканомікі».

Тым не менш рэальныя чаканні ад работы эканомікі краіны наступныя: са станоўчым вынікам спрацуюць сельская гаспадарка, будаўніцтва, сувязь, інфармацыя, фінансавы сектар. Прамысловасць наблізіцца да леташняга ўзроўню — 99,2 %.

«Галіны, якія найбольш пацярпелі ад COVID-19, застануцца ў нейтральнай альбо адмоўнай зоне. Практычна без паляпшэння — гасцінічна-турыстычны бізнес, грамадскае харчаванне, сферы спорту і забаў, транспартная галіна», — пералічыў кіраўнік Савета Міністраў.

ВУП па выніках года ўрад ацэньвае на ўзроўні 99,1–99,2 %. Пры гэтым Беларусь застанецца ў лідарах па росце эканомікі не толькі сярод суседзяў, але ў цэлым па Еўропе, заўважыў прэм'ер.

Сярэдні заробак у снежні склаў больш за 1340 рублёў (рост каля 7 %).

Урад выконвае задачу па захаванні працоўных калектываў ва ўмовах пандэміі, дадаў Раман Галоўчанка. У адносінах да мая, на які прыйшоўся пік, няпоўная занятасць знізілася ў 4,4 раза, прастоі — у 3,2 раза, але гэтыя паказчыкі перавышаюць леташні ўзровень.

«Індэкс спажывецкіх цэн ацэньваем на ўзроўні 106,9 %. Асноўная прычына некаторага перавышэння мэтавага параметра ў 105 % — дэвальвацыя рубля і перанос яе на кошт тавараў», — растлумачыў Раман Галоўчанка.

У знешнім гандлі чакаецца прафіцыт. Станоўчае сальда складзе амаль 1 мільярд долараў. З мая экспарт расце, у верасні ён стаў максімальным за год — 3,4 мільярда долараў.

«Калі падсумаваць, то ва ўмовах пандэміі ўдалося забяспечыць стабільную работу прадпрыемстваў, не даць расхістаць сістэмы адукацыі, аховы здароўя, выканаць сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы ў поўным аб'ёме, а па некаторых параметрах нават перавыканаць, не дапусціць разбалансіроўкі бюджэту і крызісу на фінансавым рынку», — адзначыў кіраўнік урада.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

У тэму

Плануючы наступны год, урад зыходзіў з таго, што на сусветных рынках працягнуцца няўпэўненасць і крызіс попыту, паведаміў журналістам прэм'ер-міністр. Пры гэтым ключавая задача выканаўчай улады — не дапусціць падзення жыццёвага ўзроўню, павялічыць рэальныя даходы насельніцтва, эканамічнымі механізмамі кантраляваць цэны і імпарт.

Раман Галоўчанка ўдакладніў, што ўрад мае на ўвазе не ўвядзенне забароны на імпарт, а распрацоўку праграм падтрымкі айчынных прадуктаў, у тым ліку на рынку паслуг. У якасці прыкладу ён прывёў санаторнае лячэнне, на якое дзяржава магла б даваць ільготныя крэдыты.

Па выніках наступнага года прагназуецца рост цэн не больш чым на 5 %. Асобна ўрад будзе кантраляваць цэны на тавары са спецыяльнага спіса, у які ўвайшлі 72 пазіцыі.

Пры гэтым размова ідзе не пра «закручванне гаек», а пра захаванне ўжо ўстаноўленых нарматываў, якія датычацца гандлёвых надбавак, дадаў прэм'ер-міністр.

Закладзены на будучы год рост ВУП на 1,8 % Раман Галоўчанка назваў напружаным для выканання, з улікам таго што сёлета, як чакаецца, эканоміка «прасядзе» не больш чым на 1 працэнт. Падзенне ВУП у іншых краінах рэгіёна прагназуецца ад 4 да 9 працэнтаў, таму там закладваецца і большы рост — каля трох працэнтаў.

«Калі беларуская эканоміка застаецца нават вышэй за 99 % (мы прагназуем), адпаведна, рост 101,8 % — той індыкатар, які мы для сябе залажылі, будзе дастаткова напружаны, — звярнуў увагу кіраўнік урада. — Задача складаная, але пралічаная, і, калі не будзе абставін, якіх мы не прадбачым, мы яе выканаем».

Сярод прыярытэтаў урад захоўвае падтрымку экспарту.

«Экспарт — гэта наша ўмова выжывання, бо зараз як ніколі ўсе змагаюцца за рынкі, — дадаў Раман Галоўчанка. — Падрыхтаваныя прапановы па спрашчэнні экспартных крэдытавання і страхавання, каб больш суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку малыя арганізацыі, маглі скарыстацца інструментамі бюджэтнай падтрымкі экспарту».

Урад таксама плануе стварыць спецыяльнае агенцтва, якое будзе займацца ўсім спектрам пытанняў падтрымкі экспарцёраў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Парламент Аргенціны ўхваліў падатак для багатых

Аргенцінскі парламент пагадзіўся з прапановай прыцягнуць у казну каля 3,7 мільярда долараў праз падатак для ўладальнікаў шматмільённых капіталаў. Грошы пойдуць на набыццё тавараў, неабходных для барацьбы з COVID-19, дапамогу бізнесу і падтрымку бедных раёнаў. Быў зацверджаны законапраект аб «салідарным і экстраардынарным укладзе» ў барацьбу з наступствамі пандэміі каранавіруса. Аб гэтым паведамляецца ў Twitter-акаўнце аргенцінскага сената — ніжняй палаты парламента. Дакумент мае на ўвазе разавае спагнанне падатку з фізічных асоб, якім належаць актывы на суму больш за 200 млн аргенцінскіх песа ($2,45 млн), паведаміла Reuters. Падатак «экстраардынарны», таму што краіна апынулася ў адпаведных абставінах, заявіла сенатар ад кіруючай партыі Анабель Фернандэс Сагасці. Паводле яе слоў, падатак выплацяць 9300 уладальнікаў буйных капіталаў. Эканоміка Аргенціны рухаецца да таго, каб трэці год запар прадэманстраваць рэцэсію, заўважыла Reuters. Краіна сутыкнулася з высокай інфляцыяй і рэзкім ростам беднасці.

У Італіі раскрылі сетку па нелегальнай перапраўцы мігрантаў

Італьянская паліцыя правяла аперацыю па спыненні дзейнасці злачыннай групоўкі, якая займалася незаконнай перапраўкай мігрантаў. Пра гэта абвясціла міністэрства ўнутраных спраў краіны. Сярод арыштаваных — грамадзяне не толькі Італіі, але таксама Ірака і Афганістана. Падчас ператрусу былі канфіскаваныя тэлефоны і камп'ютары, а таксама вялікая сума гатоўкай. У заяве МУС адзначаецца, што групоўка мела базы ў Бары, Турыне, Мілане і Вентымілі. У абмен на буйныя сумы грошай яе члены арганізоўвалі нелегальны ўезд мігрантаў у Італію або іншыя еўрапейскія краіны. Так, за падарожжа з Афганістана, Пакістана або Ірана трэба было заплаціць каля 6000 еўра за чалавека. Арышты былі праведзены на падставе вынікаў расследавання, якое вялося з 2018 года, — пасля таго, як паток мігрантаў, што прыбывае да паўднёвых берагоў Італіі (у прыватнасці, на востраў Сіцылія), моцна ўзрос.

Часопіс Time паставіў крыж на 2020-м, абвясціўшы яго найгоршым у гісторыі

Амерыканскі штотыднёвік Time размясціў на вокладцы новага нумара, які выйдзе 14 снежня, перакрэсленыя лічбы 2020 і назваў адыходзячы год найгоршым (The worst year ever). «У гісторыі ЗША і, вядома, у сусветнай гісторыі былі часы і горшыя, але большасць з нас, якія жывуць сёння, не бачылі нічога падобнага гэтаму», — піша ў вядучым рэдакцыйным артыкуле кінакрытык Стэфані Захарэк. Праводзячы аналогіі з кіно, яна выказала здагадку, што, калі б 2020-ы быў фільмам-антыўтопіяй, яго захацелася б выключыць ужо праз дваццаць хвілін. Акрамя каранавіруса і звязаных з ім праблем, журналістка згадала прыродныя бедствы — пажары ў Аўстраліі і Каліфорніі, а таксама спрэчныя дзеянні і заявы дзеючай адміністрацыі ЗША, смерці знакамітых людзей. «Часам нам трэба перажыць самыя цёмныя гадзіны. Світанак чакае свайго часу», — заўважыла Стэфані Захарэк.

Акцэнты

З НУЛЯ І НА НОВАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

У Гродне пабудуюць новую клінічную бальніцу

Аб гэтым паведаміў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК, адказваючы на пытанне аб значных сацыяльных праектах, якія цяпер рэалізуюцца ў рэгіёне.

— Прыярытэт — гэта чалавек і развіццё яго патэнцыялу, — перакананы кіраўнік абласной «вертыкалі». Таму акцэнт мясцовая ўлада робіць на развіцці значных праектаў у сферы медыцыны і адукацыі.

Так, напрыкалад, завяршаецца рэканструкцыя 4-й гарадской клінічнай бальніцы пад установу камп'ютарнага і магнітна-рэзананснага тамаграфаў, рэканструюецца і ўніверсітэцкая клініка з заменай абсталявання, вядзецца маштабнае будаўніцтва анкалагічнага дыспансера.

Дарэчы, гэты праект фінансаваўся ў суадносінах 50/50: за крэдытныя рэсурсы кувейцкага фонду і Банка развіцця. Праўда, па словах губернатара, пандэмія ўнесла свае карэктывы ў гэты праект, але не ў тэрмінах выканання. Справа ў падпісанні крэдытнай дамовы, якая часова адкладваецца. Кіраўнік вобласці растлумачыў, што паводле дамоўленасці з Мінфінам, праект у любым выпадку застанецца ў прыярытэце, і калі выдзяленне крэдытных рэсурсаў замежнага фонду зацягнецца, будуць знойдзены іншыя крыніцы фінансавання ў межах бюджэту.

Акрамя таго, старшыня аблвыканкама агучыў і навацыі, аб якіх шырокаму колу грамадскасці пакуль было невядома:

— Мы плануем уключыць у інвестпраграму на 2021 год праектаванне новай 2-й гарадской клінічнай бальніцы, таму што тая ўстанова, якая функцыянуе сёння, мала адпавядае сучасным патрабаванням, — патлумачыў Уладзімір Каранік. — Пасля ацэнкі ўсіх экспертыз пад рэканструкцыю стала зразумела, што на зробленыя ўкладанні сучасную медыцынскую ўстанову мы не атрымаем. Таму было прынята рашэнне аб будаўніцтве новай бальніцы, якая адпавядае ўсім сучасным патрабаванням, з нуля на новай пляцоўцы.

Што датычыцца праекта рэканструкцыі ўніверсітэцкай клінікі, тут прадугледжана будаўніцтва аддзялення неадкладнай дапамогі, рэканструкцыі хірургічнага комплексу, рэанімацыйных аддзяленняў.

Прыводзячы прыклады рэалізацыі значных праектаў у сферы адукацыі, старшыня аблвыканкама звярнуў увагу на завяршэнне будаўніцтва новага дзіцячага садка ў мікрараёне Грандзічы абласнога цэнтра.

— Мы працягнем будаўніцтва аб'ектаў адукацыі, для таго каб забяспечыць нашым дзецям годныя і бяспечныя ўмовы як знаходжання, так і навучання, — падкрэсліў ён.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Аты-баты

На прысягу — у масцы. А лепш паглядзець анлайн

Прысяга ва Узброеных Сілах сёлета пройдзе 12 снежня. На гэты раз на яе запросяць родных і блізкіх навабранцаў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

Але пры гэтым трэба будзе выконваць меры засцярогі ад распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Гэта абавязковы масачны рэжым і сацыяльнае дыстанцыяванне.

Пры гэтым ваеннае ведамства просіць родных і блізкіх ваеннаслужачых, не ўпэўненых у стане свайго здароўя, не ехаць у часць. Тым больш што, як і ўлетку, будзе арганізавана анлайн-трансляцыя. Яе правядуць з 72-га аб'яднанага вучэбнага цэнтра ў Печах, дзе словы аб вернасці Радзіме прамовіць больш за ўсё салдат.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Надвор'е

ХОЛАДНА І СУЦЭЛЬНЫ ГАЛАЛЁД

А ў ноч на сераду чакаецца да мінус 14 градусаў

Ды ўжо ўначы ў панядзелак мы адчулі ўплыў халоднага сібірскага антыцыклону. На большай частцы тэрыторыі краіны гэтая ноч была самая халодная ў сезоне. Тэмпература паветра ў асноўным складала 5—10 градусаў марозу, а ў сталіцы было мінус 8 градусаў. З-за ўмеранага паўднёва-ўсходняга ветру з павышанай вільготнасцю здаецца, што насамрэч яшчэ халадней. Пры гэтым снегу пакуль вельмі мала. Па Гродзенскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях яго практычна няма, а на астатняй тэрыторыі вышыня снежнага покрыва — усяго 1—3 сантыметры. Крыху больш снегу на паўночным усходзе Віцебскай вобласці.

На гэтым тыдні будзе халодна і слізка, а сібірскі антыцыклон будзе блакаваць цёплыя атлантычныя цыклоны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень цэнтр халоднага антыцыклону апынецца над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі. А таму ўмовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць яго заходняя перыферыя. Ападкаў не чакаецца. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні парывісты. Тэмпература паветра ўдзень будзе 1–6 градусаў ніжэй за нуль.

Максімальнага кантынентальнага холаду мы дачакаемся ў сераду 9 снежня. У гэты дзень надвор'е працягне вызначаць ветраная перыферыя сібірскага антыцыклону. Чакаецца пераменная воблачнасць, будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 да 14 градусаў марозу, па паўднёвым захадзе краіны — мінус 4–6 градусаў. Удзень будзе 7 градусаў ніжэй за нуль.

У чацвер надвор'е канчаткова сапсуецца, але стане крыху цяплей. Справа ў тым, што ўначы на 10 снежня захаваецца ўплыў перыферыі халоднага антыцыклону, а раніцай і ўдзень надвор'е будзе вызначаць актыўная франтальная сістэма, якая ссоўваецца з Балканскага паўвострава. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Уначы ў асобных раёнах пройдзе невялікі снег, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па паўднёвым захадзе з дажджом. Раніцай і ўдзень месцамі магчымы туман, галалёд, наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 5–12 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах — ад мінус 3 да мінус 4 градусаў. Удзень будзе ад нуля да мінус 5 градусаў, па паўднёвым захадзе — 1–2 цяпла.

Каму надвор'е ў чацвер не сапсавала настрой, хай дачакаецца пятніцы. Пры шчыльных франтальных аблоках часам чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі магчыма наліпанне мокрага снегу, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да плюс 2 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях — да мінус 7 марозу. Удзень будзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

На слыху

У Гродзенскай вобласці паліклінікі працягнуць аказваць планавую дапамогу

У паліклініках Гродзенскай вобласці працягваецца аказанне планавай дапамогі і адсутнічае неабходнасць увядзення дадатковых абмежаванняў. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.

У рэгіёне адзначаецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці зваротаў пацыентаў (як дзяцей, так і дарослых) у медустановы з нагоды вострых рэспіраторных інфекцый. На мінулым тыдні, у параўнанні з пазамінулым, зарэгістравана зніжэнне паказчыкаў захваральнасці на ВРВ на 3,9 %.

Таму паліклінікі працягваюць аказваць планавую дапамогу. Можна запісацца на планавы прыём да профільных спецыялістаў — анколага, афтальмолага, неўролага і іншых. Захаваны і прыём урачоў агульнай практыкі, якія таксама навучаны і аказваюць дапамогу па сумежных спецыяльнасцях.

У поўным аб'ёме вядзецца прыём і ў жаночых кансультацыях. Пры гэтым цяжарныя жанчыны змогуць атрымаць кансультацыю ўрача-акушэра-гінеколага і па тэлефоне. Медыцынская дапамога пажылым людзям максімальна арыентавана на яе аказанне па месцы жыхарства. З гэтай мэтай арганізавана выпіска рэцэптаў тэрмінам да шасці месяцаў, а таксама выпіска рэцэптаў на лекі за поўны кошт па тэлефоне.

Працуюць кол-цэнтры, дзе пацыенты могуць атрымаць інфармацыю аб арганізацыі кансультацыйнай дапамогі ў паліклініцы. Тут жа можна атрымаць інфармацыю аб запісе на адтэрмінаваную кансультацыю — пасля нармалізацыі эпідэміялагічнай абстаноўкі.

У Гродзенскай вобласці працягваецца аказанне медыцынскай адпамогі ў стацыянарах дзецям, цяжарным жанчынам, пацыентам з анкалагічнымі і гематалагічнымі хваробамі. Захавана аказанне кардыяхірургічнай дапамогі, правядзенне медыка-сацыяльнай экспертызы і іншых відаў спецыялізаванай дапамогі. Пры гэтым перад шпіталізацыяй пацыенты абавязаны прайсці тэсціраванне на наяўнасць каранавіруснай інфекцыі.

Ва ўсіх паліклініках, у тым ліку дзіцячых, арганізаваны асобны ўваход для пацыентаў з павышанай тэмпературай, праводзіцца тэрмаметрыя.

4 снежня стала вядома, што ў мінскіх паліклініках прыпыняюць аказанне планавай медыцынскай дапамогі. Гэта звязана з COVID-19. Адпаведны загад № 632 выдаў камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама. Гэта значыць, што з панядзелка адменены талоны, якія датычацца планавай дапамогі.

Алена КРАВЕЦ.

Акцыя

Падары веру ў цуд!

Каля сотні «Ёлак жаданняў» установяць на Гомельшчыне

Арганізатары праекта — Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа.

redcross-gomel.by/

— Мы плануем устанавіць на тэрыторыі Гомельскай вобласці каля ста «Ёлак жаданняў», якія дазволяць падрыхтаваць значную колькасць навагодніх падарункаў для тых, хто гэтага чакае і мае такую патрэбу, — паведаміла **член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі БТЧК Ала СМАЛЯК.** — Традыцыйна ў акцыі бяруць удзел мецэнаты: дзяржаўныя і недзяржаўныя прадпрыемствы, арганізацыі, а таксама неабыякавыя людзі і валанцёры.

Вядома, што «Ёлкі жаданняў» размесцяцца ў першасных арганізацыях Чырвонага Крыжа і ў гандлёвых аб'ектах прадпрымальнікаў, якія выказалі гатоўнасць паўдзельнічаць у дабрачыннай акцыі. На ёлках размесцяць паштоўкі з пажаданнямі. Кожны зможа зрабіць падарунак, аб якім дзіця просіць у паштоўцы. Пасля ўсё абавязкова перададуць адрасатам.

— «Ёлка жаданняў» — штогадовы навагодні праект Чырвонага Крыжа, які дорыць веру ў цуд. Напрыклад, у навагоднія святы 2019/2020 падарункі падчас дабрачыннай кампаніі атрымала больш за 2,6 тысячы дзяцей з Гомельскай вобласці, — падкрэсліла сенатар.

Свае запаветныя мары могуць перадаць дзеці са шматдзетных, малазабяспечаных, няпоўных сем'яў і сем'яў са статусам бежанцаў, а таксама дзеці з асаблівасцямі развіцця. Пасля ўдзельнікаў кожнай «Ёлкі жаданняў» запросяць на дабрачынны ранішнік. Сёлета з-за эпідэміялагічнай сітуацыі ён пройдзе ў скарочаным фармаце з захаваннем усіх мер бяспекі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота з архіва Гомельскай абласной арганізацыі БТЧК.

Фінансы

Золатавалютныя рэзервы краіны склалі 7,37 мільярда долараў

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 снежня, паводле папярэдніх звестак, склалі 7 376,3 млн долараў ЗША (у эквіваленце), паведаміла служба ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка краіны.

У лістападзе ўрадам выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 388 млн долараў. Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у лістападзе спрыялі купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», а таксама паступленне замежнай валюты ў бюджэт.

Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2021 года павінен скласці не менш за 7,3 млрд долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Алене Уладзіміраўне Аношцы, кансультанту ўпраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі, у сувязі з вялікім горам, якое яе спасцігла, — смерцю МАЦІ.

Разумныя грошы

Я пазнаю цябе па голасе

Беларускі камерцыйны банк удасканаліў тэхналогію галасавой біяметрыі. Пасля інтэграцыі штучнага інтэлекту віртуальны памочнік пазнае людзей па голасе без лішніх пытанняў.

ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ

Цэнтр кліенцкай падтрымкі банкаў стаў першым кантакт-цэнтрам у Беларусі, дзе рэалізаваны ўсе сучасныя AI-тэхналогіі па апрацоўцы натуральнай гаворкі. Гэта дазваляе аператыўна вырашаць большасць пытанняў без удзелу аператара, што зручна для самога кліента. Але гэта таксама павышае эфектыўнасць сэрвіснай падтрымкі, бо віртуальны памочнік здольны паўнавартасна адказаць прыкладна на траціну зваротаў. І гэта не мяжа: з кожным месяцам бот асвойвае новыя навыкі і магчымасці. «Тое, што раней здавалася фантастыкай, сёння становіцца рэальнасцю», — адзначыў **намеснік старшыні праўлення БПС-Ашчадбанка Алег БАРОДКА.**

Спецыялісты ўпершыню ў нашай краіне аб'ядналі ў адным кліенцкім сцэнарыі тэхналогію распазнавання натуральнага маўлення і галасавую біяметрыю. Тым самым у банку плануюць павысіць хуткасць і якасць абслугоўвання. Гэта таксама ўзмоцніць бяспеку сэрвіснай падтрымкі ў дыстанцыйным фармаце.

Асноўныя прычыны ўкаранення біяметрыі банкамі — гэта скарачэнне аперацыйных выдаткаў на абслугоўванне офісаў, павышэнне якасці паслуг і павелічэнне колькасці кліентаў. На сённяшні дзень заканадаўства і тэхналогіі аддаленай ідэнтыфікацыі з выкарыстаннем біяметрычных даных чалавека дазваляюць адкрыць рахунак або атрымаць крэдыт, не звяртаючыся ў офіс банка. Гэта дае магчымасць крэдытным арганізацыям, з аднаго боку, знізіць колькасць наведвальнікаў у офісах, з другога боку — павялічыць колькасць кліентаў за кошт павышэння зручнасці і хуткасці аказання паслуг.

Тэхналогіі біяметрыі дапамагаюць павышаць зручнасць і скарачаць хуткасць абслугоўвання кліентаў да 20-40 секундаў. Раней, каб верыфікаваць кліента, аператару цэнтра апрацоўкі выклікаў банка даводзілася ўдакладняць, напрыклад, даныя пашпарта, кодавыя словы і іншае. Цяпер у гэтым няма неабходнасці. Акрамя гэтага, галасавая біяметрыя дазваляе павысіць эфектыўнасць работы кантактнага цэнтра і скараціць штат аператараў на 10-20 %.

СУСВЕТНЫЯ ТРЭНДЫ

Тэхнічны дырэктар Trend Micro ў Расіі і СНД Міхаіл КАНДРАШЫН адзначае, што мільёны кліентаў у Bank of America, JPMorgan Chase і Wells Fargo рэгулярна выкарыстоўваюць адбіткі пальцаў для ўваходу ў свае акаўнты праз мабільныя праграмы. Апошняя кампанія нават дазваляе карпаратыўным кліентам сканаваць сятчатку вока з дапамогай мабільнага тэлефона.

Найбольшай папулярнасцю карыстаецца ідэнтыфікацыя кліентаў па голасе. Замест таго каб марнаваць да сямі хвілін, адказваючы спецыялісту кантакт-цэнтра на сакрэтныя пытанні, кліентам трэба ўсяго 20 секундаў, каб пацвердзіць сваю асобу голасам. Напрыклад, у Barclays больш за 65 % званкоў кліентаў апрацоўваецца пры дапамозе галасавой верыфікацыі. Выкарыстоўваючы той жа метад, Banco Santander Mexico не проста скараціў час аўтэнтыфікацыі на 42 секунды, але яшчэ і сэканоміў 1 млн долараў.

Кампанія Citigroup ідэнтыфікуе па голасе 800 тысяч сваіх кліентаў з крэдыткамі, а 90 % кліентаў славацкага Tatra Bank расказалі, што аддалі перавагу галасавой біяметрыі перад традыцыйнай сістэмай верыфікацыі карыстальнікаў.

У фінансавай групы HSBC, дзе амаль палова ўсіх новых уліковых запісаў адкрываецца анлайн, бізнес-кліенты цяпер могуць адкрыць новы рахунак, робячы сэлфі для праверкі сваёй асобы. Кампанія USAA, якая аказвае страхавыя і банкаўскія паслугі вайскоўцам і іх сем'ям, вызначае некаторых кліентаў па контуры асобы. У цэлым, паводле даследавання Biometrics for Banking, да канца 2020 года 1,9 млрд карыстальнікаў па ўсім свеце будуць выкарыстоўваць біяметрыю для атрымання банкаўскіх паслуг.

Яе прымяненне для ідэнтыфікацыі і ёсць адзін з асноўных трэндаў інфармацыйнай бяспекі, якія павышаюць абароненасць сістэм, бо ўцечка або крадзеж аўтарызацыйнай біяметрыі (напрыклад, хэша адбітка пальцаў) нічога зламысніку не дасць. У гэтым і сутнасць тэхналогіі. Іншая справа, што сумесна з гэтай інфармацыяй заўсёды ідуць і іншыя персанальныя даныя: уліковы запіс, кантактная інфармацыя, імя, прозвішча. Банкі павінны імкнуцца да таго, каб не адбывалася нават прыватных уцечак, асабліва калі гаворка ідзе пра такую крытычную інфармацыю, як узоры голасу і выяву чалавека.

Эксперты салідарныя, што банкаўская біяметрыя павінна быць добраахвотнай для кліентаў. «Банкі не павінны навязваць аддаленую ідэнтыфікацыю без тлумачэння магчымых негатыўных наступстваў. Вельмі важна, каб у кліентаў была магчымасць выбару альтэрнатыўных варыянтаў ідэнтыфікацыі, уключаючы асабістую прысутнасць. Каб засцерагчы сябе, чалавек павінен сам прымаць рашэнне аб неабходнасці падобнай паслугі ў балансе паміж зручнасцю і фінансавымі рызыкамі, якія ён можа панесці ў выпадку кампраметацыі яго асобы», — лічаць беларускія спецыялісты.

Віртуальныя «гульні» — рэальныя страты

Па той бок манітора — усё вельмі сур'ёзна

Гэта неверагодна, але факт — сярэдні ўзрост кіберзлачынцаў знізіўся да 17 гадоў. Прыкладна 85-90 % кіберашуканцаў — маладыя людзі, не старэйшыя за 20 гадоў.

Калі мы сядаем за камп'ютар і пачынаем інкогніта мець зносіны ў сацыяльных сетках, калі пачынаем ствараць хітрыя праграмы і спрабуем іх дзеянне на жывых людзях, мы павінны разумець, дзе цяпер дзіцячыя гульні заканчваюцца і пачынаюцца дзеянні злачыннага характару з выкарыстаннем электронных тэхналогій для атрымання выгады. Гэта і ёсць кіберзлачынствы.

Такія супрацьпраўныя дзеянні ўключаюць:

— распаўсюджванне шкоднасных праграм;

— выкраданне пароляў;

— крадзеж рэквізітаў пластыкавых картак, якія вырабляюцца банкамі;

— распаўсюджванне забароненай інфармацыі (паклёп, звесткі, якія ўзбуджаюць нацыянальныя канфлікты, і іншыя супрацьпраўныя матэрыялы).

Гэтыя дзеянні здзяйсняюцца з мэтай атрымання фінансавых сродкаў, або атрымання інфармацыі для наступных вымагальніцтваў, або персанальнай нажывы. У адным выпадку злачынцы ажыццяўляюць напады на камп'ютары. У іншым — распаўсюджваюць шкоднасныя праграмы, атрымліваюць незаконную інфармацыю ці крыптавалюту.

Фішынг, або аферы з электроннай поштай

Вячаслаў Сенін адзначае, што сёлета эксперты кампаніі Check Point выявілі ўсплёск нападаў праграм-вымагальнікаў на медыцынскія ўстановы. Сітуацыя, якая склалася ў свеце ў сувязі з пандэміяй, прыцягнула ў сферу аховы здароўя шмат ашуканцаў. Медыцынскія ўстановы працуюць па састарэлай схеме, рэдка абнаўляюць праграмнае забеспячэнне, і адсюль атрымліваецца такі сумны вынік.

— Нават спам, які мы атрымліваем штодня, адносяць да кіберзлачынстваў. Любую рассылку, якую атрымліваем па розных каналах камунікацыі без наяўнасці згоды, можна аднесці да спама. У асобную групу кіберзлачынстваў можна вынесці тэрарызм, грумінг, кібербулінг, — кажа Вячаслаў Сенін.

Сёння кожны карыстальнік камп'ютарнай сеткі атрымлівае вялікую колькасць лістоў, паведамленняў з просьбай перайсці на той ці іншы сайт, адкрыць «важнае» ўлажэнне.

Ботнэт — гэта віртуальная сетка, якая складаецца з вызначанага ліку хостаў, дзе ўстаноўлены і выконваюць пэўныя аперацыі боты. Часта бот, які ўваходзіць у склад ботнэту, з'яўляецца схаванай праграмай махляра.

DDOS (англійскае «адмова ў абслугоўванні») — атака, якая мае намер вывесці з рабочага стану пэўную сістэму.

Кібершантаж. Ашуканцы могуць скарыстацца DDOS-нападамі для вымагання грошай. Недзе 5-10 гадоў таму кібершантаж актыўна ўжываўся пры наведванні ўладальнікам камп'ютара парнасайтаў.

Крыптаджэкінг. Альбо па-іншаму **майнінг** — «здабыча» крыптавалюты з дапамогай іншага рэсурсу, вядома ж, без апавяшчэння гаспадара.

Кібершпіянаж. Тут ідзе гаворка аб атрыманні інфармацыі дзяржаўных або прыватных прадпрыемстваў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І распазнаць сярод усяго гэтага непажаданую інфармацыю вельмі складана. Кіберзлачынцы гатовыя ствараць цэлы ботнэт для крадзяжу даных і грашовых сродкаў або DDOS-нападаў і іншых. Важна не губляць пільнасць, быць насцярожанымі да спам-лістоў і правяраць падазроную інфармацыю.

— Аналагам фішынгу можна назваць вішынг. У гэтым выпадку кібермахляры выкарыстоўваюць тэлефонную сувязь. Мэта адна — атрымаць даныя банкаўскай карткі, прымусіць прайсці на падроблены сайт, а там — здзейсніць куплю альбо выканаць іншыя аперацыі са сваім грашовым рахункам. Неабходна ведаць, што сутнасць такіх размоў у псіхалагічным уздзеянні на ахвяру, — працягвае эксперт.

Цяпер атакуюць рахункі прыватнікаў, наступныя — буйныя прадпрыемствы

Галоўнай мэтай фінансавага махлярства з'яўляецца атрыманне даных аб банкаўскіх картках пакупнікоў. У Следчым камітэце Беларусі адзначаюць, што колькасць узбуджаных крымінальных спраў павялічылася за апошні год на 5,5 %.

— Асноўнай прычынай здзяйснення кіберзлачынстваў з'яўляецца бестурботнасць грамадзян і юрыдычных асоб. Камп'ютарная адукаванасць насельніцтва адстае ад хуткасці ўкаранення новых тэхналогій. Многія людзі фармальна ставяцца да абароны і бяспекі сваіх даных, — каментуе Вячаслаў Сенін. — На жаль, па прагнозах экспертаў, страты ад кіберзлачынстваў у 2021 годзе могуць вырасці на 30 %.

Будуць здзяйсняцца маштабныя атакі і выхады злачынцаў на новыя рынкі, прагназуюць эксперты. А кампаніі, якія спецыялізуюцца на супрацьдзеянні кібератакам, будуць больш актыўна выкарыстоўваць тэхналогіі штучнага інтэлекту.

У апошні час вялікую цікавасць віртуальных злачынцаў часта выклікаюць буйныя прадпрыемствы, а іх кіраўніцтва несур'ёзна ўспрымае падобныя пагрозы. Здзяйсненне нападаў на аўтаматызаваныя сістэмы кіравання можа прыводзіць да сур'ёзных наступстваў, аж да аварый.

Якія меры персанальнай бяспекі варта прадпрымаць:

1. Нікому не перадавайце сваю банкаўскую картку і пароль ад яе.

2. У выпадку страты пластыкавай карткі або спісання грашовых сродкаў, якое вы не ажыццяўлялі, неадкладна апавясціце банк па тэлефоне службы кліенцкай падтрымкі, указаным на адваротным баку карткі, ці любым зручным для вас спосабам (USSD-запыт, інтэрнэт або мабільны банкінг).

3. Западозрылі, што вам тэлефануе махляр? Пакладзіце трубку і патэлефануйце ў банк па тэлефоне службы кліенцкай падтрымкі, каб удакладніць атрыманую інфармацыю. Важна не ператэлефаноўваць па нумары, які выклікаў у вас сумненні. Набярыце нумар банка, указаны на сайце банка ці адваротным баку вашай карткі.

4. Не забывайце: супрацоўніку банка не патрэбна інфармацыя пра нумар вашай банкаўскай карткі і камбінацыі пароляў.

5. Не пераходзьце па шкоднасных спасылках з электроннай пошты, СМС або месенджараў, анлайн-рэкламы на сайты-аналагі пошукавых сістэм, папулярных інтэрнэт-крам, рэсурсаў дзяржустаноў, банкаў. Такія фэйкавыя сайты называюць «фішынгавыя». Фішынг — гэта від махлярства ў інтэрнэце, мэтай якога з'яўляецца атрыманне доступу да даных. Наглядная ілюстрацыя фішынгу — атрыманне ліставу ад «банка» з мэтай пацвердзіць свае канфідэнцыйныя даныя па спасылцы. Перадача персанальных даных можа скончыцца крадзяжом грошай.

6. Не загружайце праграмнае забеспячэнне, паходжанне якога выклікае сумненне.

Прыклад фішынгавай старонкі і спасылкі, якую адпраўляе злачынец сваёй ахвяры

Вячаслаў Сенін прапануе адзін раз (толькі адзін і цяпер) згуляць у паддаўкі. Дапусцім, патэнцыйную ахвяру злачынец чакае на сайце-«барахолцы». Прадстаўляецца пакупніком і выказвае жаданне набыць заяўлены тавар. Паведамляе, што хацеў бы аформіць куплю з дапамогай кур'ера і гатовы аплаціць тавар загадзя. Ахвяры высылае спасылку, па якой яна нібыта павінна атрымаць сродкі.



Пасля таго як ахвяра націскае кнопку «атрымаць сродкі», яна трапляе на такую старонку:



Гэта і ёсць фішынгавая старонка, якая просіць ад ахвяры даныя банкаўскай карты. Як толькі вы ўведзяце свае даныя, яны будуць выкрадзеныя злачынцам.



Не рабіце такога ніколі. Не трэба.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Рэпарцёр

КАЛІ МАРА «ЗУБРЫЦЬ»...

Жыхарам Гомельшчыны, каб убачыць адзін з галоўных сімвалаў Беларусі — велічных зуброў — цяпер неабавязкова накіроўвацца ў Белавежскую пушчу. Знакамітых беларускіх суродзічаў амерыканскіх бізонаў, апошніх дзікіх быкоў Еўропы, цяпер можна сустрэць пад Гомелем.

Гомельскі раён, тэрыторыя Бабовічскага сельскага Савета, кантактны заапарк «Белладжыё» цэнтра экалагічнага турызму, узбярэжжа возера Чарнецкае... Маляўнічы куток у 15 кіламетрах ад Гомеля — вось новая прапіска зуброў у паўднёва-ўсходнім рэгіёне Беларусі. На Гомельшчыну прыехалі дзве жывёліны. Братам-зубранятам паўтара года.

У ЧЫМ СІЛА, БРАТ?

— Натуральна, што ідэя набыць зубра нарадзілася не спантанна. Вельмі даўно я марыў адкрыць у турстычнай справе нешта такое, чаго няма ў Гомелі. Два гады таму тут, на тэрыторыі аграсядзібы, мы адкрылі кантактны заапарк. Зубры — жамчужына нашай кашлата-хвастатай кампаніі, у якой 100 жывёл, — расказвае сваю гісторыю зубравода-аматара **дырэктар цэнтра экалагічнага турызму Васіль АНТОНАЎ.**

— Мы ведалі, што людзі абавязкова зацікавяцца тым, чаго не бачылі раней. Вось, напрыклад, калі дэльфінаў прывозілі ў Гомель, людзі скупілі ўсе квіткі. Матылёў экзатычных — таксама шмат гледачоў. Зубр — гэта наша «фішка»!

У пошуках цара пушчы Васіль Антонаў аб'ездзіў амаль паўкраіны. З радасцю ўспрыняў навіну аб нараджэнні зубранят у мінскім заапарку. Пачакаў, пакуль жывёлы крыху падрастуць, і замовіў спецперавозку са сталіцы ў Гомельскі раён. Напярэдадні года Быка даўняя мара дырэктара цэнтра экалагічнага турызму споўнілася. Тут упэўненыя: знакаміты сімвал Беларусі на Гомельшчыне — добры знак для роднага рэгіёна!

— Мы спыніліся на прапанове мінскага заапарка, бо для нас важна, каб жывёлы былі «вальерныя», — тлумачыць гаспадар заапарка. З Мінска зубры прыехалі ў спецыяльных кантэйнерах. Да прыезду доўгачаканых гасцей на Гомельшчыну новыя гаспадары рыхтаваліся загадзя: старанна вывучылі характар велічных жывёл, іх патрэбы, падрыхтавалі тэрыторыю.

— Зрабілі вальер больш чым на дзесяці «сотках», пабудавалі кармушкі і ценявыя навесы, дзе жывёлы адпачываюць, — расказвае Васіль Мікалаевіч, як імкнецца аблегчыць адаптацыю братоў-зуброў у новых умовах. — У сеціве зараз вельмі шмат інфармацыі пра іх утрыманне. Галоўнае — зрабіць усё так, як неабходна па нормах.

БІЗОНЫ-БЛІЗНЯТЫ

Тое, што цяпер гомельскія зубры яшчэ не зусім падобныя на сваіх магутных суродзічаў з Белавежы, — пытанне часу. Праз некалькі гадоў маладыя жывёліны будуць ростам з агароджу вальера, а вага кожнага з іх перавысіць тону. Палаваспеласць зубра наступае ў трычатыры гады, да гэтага моманту яны набіраюць аб'ём масы цела. Цяпер жа кожны з братоў важыць каля 300 кілаграмаў.

— Цікава, што нашы зубры — браты-блізняты. Гэта вельмі рэдкая з'ява для зуброў, звычайна ў маці нараджаецца толькі адзін малы раз у два-тры гады, — тлумачыць Васіль Антонаў і адказвае на традыцыйнае пытанне: як пракарміць гэту «парачку»?

— Каля пяці кілаграмаў морквы і столькі ж яблыкаў плюс сухафрукты, буракі, гарбузы, сена — гэта меню на дзень толькі на аднаго зубра. Батон, як высветлілася, таксама любяць — ласуны. Вось думаем збожжам іх пачаць карміць, — выдае гастранамічныя пажаданні падапечных гаспадар зуброў. На пытанне, ці вызначалі яны і жывёліны, хто тут «галоўны», Васіль Мікалаевіч з усмешкай выдае: — Той, хто з морквай прыйшоў.

БАРОН, БУЧ, БУМЕР, БОС...

Гаспадар заапарка звяртае ўвагу, што зубры пакуль не атрымалі мянушак. Ёсць няпісанае правіла даваць імя зубрам па першай літары краіны, дзе яны нарадзіліся. У мінскім заапарку новаму гаспадару прапанавалі назваць блізнят Бяша і Буяша. Але Васілю Мікалаевічу і калектыву заапарка гэтыя варыянты даспадобы не прыйшліся. Вырашылі, што госці кантактнага заапарка дапамогуць з пошукам імёнаў. Але, кажуць, справа застапарылася. Пакуль прапануюць толькі занадта дзіцячыя мянушкі. Так што ў заапарку дагэтуль адкрыты хіт-парад імёнаў, але брутальных.

— Любы жадаючы можа прапанаваць свой варыянт імя, прыехаўшы да нас або даслаўшы паведамленне ў сацсетках, якія мы актыўна вядзём. Абавязковая ўмова: мянушкі павінны пачынацца на літару «Б», бо чырванакніжныя жывёлы нарадзіліся ў Беларусі, — тлумачыць Васіль Антонаў.

Скарыстаўшыся магчымасцю, ён праводзіць невялікую экскурсію па кантактным заапарку, у якім каля 40 разнастайных відаў жывёл. На 80 гектарах зямлі для іх створаныя ўмовы, максімальна блізкія да натуральных.

— Ідэя стварыць заапарк увогуле нарадзілася пасля нечаканага падарунка сяброў. Гэта былі маленькія гусяняты, — дзеліцца Васіль Мікалаевіч. — Потым хтосьці прыносіў параненае птушаня або дзіцяня жывёлы, пасля пачаў набываць іх у заапарках і заасадах па ўсёй краіне.

У многіх падрастае ўжо і патомства. Цяпер у асобных вальерах больш за сто насельнікаў. Яны з радасцю сустракаюць усіх, хто хоча бліжэй пазнаёміцца з рэдкімі дзікімі і хатнімі жывёламі і птушкамі.

МАРА — ПАКЛАСЦІ ПАЧАТАК ПАПУЛЯЦЫІ

— Сучасныя дзеці, асабліва тыя, што жывуць у горадзе, часам ні разу ўжывую не бачылі звычайных парсючкоў, не кажучы ўжо пра насельнікаў лесу і больш экзатычных жывёл. Мы дапамагаем ім пазнаёміцца з апошнімі дзвюма катэгорыямі і даведацца больш аб характарах і норавах звяроў, а самае галоўнае — дзеці могуць палашчыць і пакарміць жывёл і птушак, — расказвае гаспадар.

Алтайскі марал, племяныя алені, в'етнамскія кабаны, страусы, каліфарнійскія трусы, козлікі, бараны, некалькі дзясяткаў пар гусей... Асобных насельнікаў заапарка ўжо адправілі на зімоўку — гэта чорныя лебедзі і дзікабразы. У вальерах можна пабачыць шустрых казуль. Іх знайшлі малымі і выгадавалі. Асобная гісторыя ў заапарку звязана з яшчэ адным знайдышам — ласіхай Маяй. Яна нарадзілася ў апошнім месяцы вясны, за што і атрымала сваю мянушку. Ласяня ледзь жывое знайшлі сёлета ў Веткаўскім раёне мясцовыя жыхары. Прынялі рашэнне пакінуць тут, у цэнтры экалагічнага турызму. Яе выходжвалі чытыры месяцы, а пакуль Мая падрастала, выпівала дзевяць літраў цёплага малака штодня. Цяпер ласіха ў самым росквіце сіл і, як кажуць, навыданні.

У планах Васіля Антонава — набыць яшчэ мангаліц: гэта венгерская парода хатніх свіней. З буйных жывёл ён мае намер завесці тыбецкіх якаў. Дарэчы, не выключае, што ў хуткім часе іх вялікую звярыную і птушыную каманду папоўняць і страусы эму.

Цяпер жа ўсе думкі аб папаўненні зубрынага статка. У планах — налета набыць зуброў-«дзяўчынак». Запаветная мара Васіля Антонава — даць пачатак папуляцыі зуброў у Гомельскім раёне. Дарэчы, у заапарку заклікаюць прадпрыемствы, арганізацыі, індывідуальных прадпрымальнікаў і проста ўсіх неабыякавых жыхароў Гомельшчыны далучыцца да ажыццяўлення гэтай ідэі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Марыі АМЕЛІНАЙ.

Будаўніцтва

З аўтаномнай электракацельняй

Як мінімум у пяці раёнах Гомельшчыны плануюць пабудаваць электрадамы

gomel-region.by

У 2021 годзе на тэрыторыі рэгіёна будзе здадзена больш за 16 тысяч квадратных метраў электрадамоў. Аб гэтым падчас работы ў грамадскай прыёмнай пры Гомельскім аблвыканкаме паведаміў старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама Дзмітрый ГАЙКЕВІЧ.

Ён нагадаў, што ў рэгіёне электрадамы ўжо пачалі ўзводзіць сёлета. Першы дом з аўтаномнай электракацельняй адкрылі ў пасёлку Бальшавік Гомельскага раёна 7 лістапада. Да канца года яшчэ адзін падобны дом увядуць у экспуатацыю ў абласным цэнтры. Агульная плошча такога жылля складзе больш за 7 тысяч квадратных метраў.

Старшыня камітэта ўдакладніў, што налета плануецца ўвесці электрадамы ў Тураве, рабочым пасёлку Хваёвы Бор, што ў Светлагорскім раёне, а таксама ў Калінкавічах, Петрыкаве, Брагіне і Гомелі.

— Агульная плошча такіх дамоў складзе не менш за 16,2 тысячы квадратных метраў, — удакладніў Дзмітрый Гайкевіч. Будаўніцтва ўжо пачалося ў Тураве, Хваёвым Бары, Петрыкаве, Калінкавічах і Гомелі. Вызначаюцца таксама пляцоўкі і ў іншых раёнах.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Экалагічна і карысна

Тэтрапак пачнуць перапрацоўваць у Беларусі

Гэтую шматслойную ўпакоўку ў якасці другаснага рэсурсу раней было немагчыма выкарыстаць, таму ў яе быў адзіны шлях — пахаванне на палігоне ЦКА.

Усе мы як спажыўцы, напэўна, не раз куплялі сокі і кісламалочныя напоі ў кардоннай упакоўцы: зручна захоўваць, зручна карыстацца — асноўныя перавагі ў выбары прадуктаў у тэтрапаку. А ці шмат разоў мы задумваліся над тым, што адбываецца з пустой каробкай далей, пасля таго, як напой мы ўжо выкарысталі? І калі палімерныя пакункі, кантэйнеры з-пад ежы, пластыкавыя бутэлечкі ад мыйных сродкаў можна перапрацаваць (інакш выкарыстаць у якасці другаснай сыравіны), то тэтрапак як шматслойная ўпакоўка для гэтага не падыходзіла. Таму накіроўвалася адразу на палігоны цвёрдых камунальных адходаў. Але ў хуткім часе сітуацыя павінна выправіцца.

Як расказаў **міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ,** новая вытворчасць па выкарыстанні тэтрапака і іншай цэлюлозазмяшчальнай упакоўкі з'явіцца ў Мінскай вобласці на базе Пухавіцкай кардоннай фабрыкі. Увесці ў эксплуатацыю аб'ект плануецца ў першым квартале 2021 года. А пакуль што смеццесартавальныя заводы назапашваюць гэтую ўпакоўку для далейшай яе перапрацоўкі ў якасці другаснай сыравіны.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **КСУП «Вензовец»** (УНП 500056209), 231488, аг. Вензовец, ул. Новая, 1в Дятловского р-на Гродненской обл., тел./факс: +375 1563 67-1-21, 67-1-41, в лице антикризисного управляющего Мельникова Евгения Витальевича.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **23 декабря 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

Предмет торгов –

комбайн свеклоуборочный Kleine SF-10-2,
рег. знак СВ-4 0060, 2008 г. в., кузов (рама) № 2310043, местонахождение – Гродненская обл., Дятловский р-н, аг. Вензовец, ул. Новая, 2Б.

Начальная цена – 36 800,00 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.12.2020 г. 09.00 по 22.12.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Гродзенская праўда» от 29.08.2020 г.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **Государственное предприятие «Слава труду»** (УНП 500056012), 231482, Гродненская обл., Дятловский р-н., г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а, тел./факс (01563) 30-1-95, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **23 декабря 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	Комбайн свеклоуборочный KLEINE SF-10-2, 2007 г. в., инв. № 974, рег. знак ГГ5479	30 400,00
	Местонахождение – Гродненская обл., Дятловский р-н, мехмастерские д. Скипоровичи	
2	Комплекс обьектов недвижимости в составе: здание проходной, сооружение дезбарьер, костесборник, здание колбасного цеха, здание консервного цеха, склад инвентаря, склад инвентаря, сооружение благоустройства, отделитель жира, отделитель жира, канализационная сеть, водопроводная сеть, электрические сети, газопровод высокого и низкого давления, расположенные по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, Козловщинский с/с, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а	402 972,69
3	Дом отдыха «Реченька» и здание № 2 Дома отдыха «Реченька», инв. № 451/С-14866, Гродненская обл., Дятловский р-н, Козловщинский с/с, 5/1, 3 км северо-западнее д. Скрунди	54 820,48

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.12.2020 г. 09.00 по 22.12.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 17.10.2020 г.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Доломит»

Лот № 1: **магазин, инв. № 200/С-59663,** площадь – 390,4 кв. м. Адрес: г. Витебск, ул. Партизанская, 3. Начальная цена, бел. руб. – 65 300,00 с НДС. Задаток, бел. руб. – 6 530,00. Шаг аукциона – 5 %. Земельный участок площадью 0,0912 га с кадастровым номером 240155400001000223. Целевое назначение: земельный участок для содержания и обслуживания жилого дома с пристроенным магазином. Право аренды (по 31.05.2040). Доля: 3/4. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится 15.01.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 13.01.2021 в 11.00.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ООО «Внешагрогрупп»:** г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, оф. 505, УНП 191872757, в лице антикризисного управляющего ИП Угольника Дмитрия Геннадьевича: 220136, г. Минск, а/я 194, тел. +37529 6363522.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **23 декабря 2020 г. в 09.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов – дебиторская задолженность в пользу ООО «Внешагрогрупп», наименование дебитора	Размер дебиторской задолженности, бел. руб. без НДС	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	АгроДитан ООО	68 059,85	680,60
2	БелМясАгроТорг ООО	52 779,59	527,80
3	БелСлучь ОАО	11 594,77	349,73
4	Боровиковой Т.А. КФХ	1980,61	77,69
5	Вишневецкий Агро ОАО	12 691,98	129,86
6	Ганцевичский райагросервис ОАО	6828,1	68,28
7	Глусская заря ОАО	39 157,71	391,58
8	ДОЦЕНДО НП ООО	8 410,27	84,10
9	Дрогичинский ККЗ ОАО	26 676,48	266,77
10	Друзик В.А. КФХ	7 044,23	70,44
11	Друзик В.А. КФХ	8 030,09	80,30
12	Заря Коммуны ОАО	774,55	7,75
13	МайскоеАгро ОАО	59 112,52	602,75
14	Милославская Светлана Михайловна ИП	1 464,29	14,64
15	Михалевская Нива ОАО	15 081,32	150,81
16	НовБелТех ООО	20 599,78	206,00
17	Первомайский ОАО	90 122,45	901,25
18	Петровичи ОАО	5 452,75	64,83
19	Полесье-Агро ОАО	4 676,26	46,77
20	Полесье ОАО	2 756,26	63,52
21	Рованичи ОАО (правопреемник ГП Ганута Агро)	32 026,43	330,56
22	Сейкобел ООО	7 576,39	75,76
23	Солигорский райагросервис ОАО	1 133,50	11,34
24	Тимирязевский ОАО	11 320,76	113,21
25	Чашникский агросервис ОАО	2 902,95	34,37
26	Юрковичи ОАО	8 138,90	81,39

Тел. для ознакомления +37529 636-35-22.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.12.2020 г. 09.00 по 22.12.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи – в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – в течение 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.11.2020 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 30 декабря 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4)
Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211
Местонахождение – Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1
Начальная цена – 1 591 507,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 159 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **30 декабря 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 09.12.2020 по 28.12.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 января 2021 года проводит 1-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
1	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КМ-66 из-под радиостанции Р-140-0,5 в составе: автошасси ГАЗ-66-15 ш. 0504233 рег. № 5693 МИМ 1987 г. *пробег 1291 км.* Кузов-фургон КМ-66 1987 г.	г. Минск, областное УМЧС	4 500,00	900,00
2	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 49036385 1985 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-15 ш. 0403683 дв. 42946 1985 г. *3 кат. 1550 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	4 400,00	880,00
3	Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 41001384 1984 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0366301 дв. 66255 1984 г. *3 кат. 3954 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	4 400,00	880,00
4	Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном КБ1-375 в составе: кузов-фургон КБ1-375 № 040730 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 445615 дв. 547900 1986 г. *4 кат. 1820 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 700,00	1 540,00
5	Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5151 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) ш. 10Е8903005 дв. 8854272 1989 г. *4 кат. 5414 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № ЮП7904ТДИМ 1989 г. 4 кат.	г. Осиповичи, в/ч 01313	59 000,00	11 800,00
6	Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5439 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) ш. 10Е8908005 дв. 8927347 1989 г. *4 кат. 6630 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № КВ1432ББМД 1989 г. 4 кат.	г. Осиповичи, в/ч 01313	59 000,00	11 800,00
7	Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5536 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) ш. 10Е9003017 дв. 9000898 1990 г. *4 кат. 5465 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № ЮП7904ТДПО 1990 г. 4 кат.	г. Осиповичи, в/ч 01313	59 000,00	11 800,00
8	Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5335 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) ш. 10Е8904018 дв. 8911330 1989 г. *4 кат. 4564 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № ЮС7904ДРСД 1989 г. 4 кат.	г. Осиповичи, в/ч 01313	59 000,00	11 800,00
9	Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5149 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) ш. 10Е8901027 дв. 8843729 1989 г. *4 кат. 9053 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БД3658СММТ 1989 г. 4 кат.	г. Осиповичи, в/ч 01313	59 000,00	11 800,00
10	Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5440 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) ш. 10Е8906031 дв. 8911947 1989 г. *4 кат. 7652 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БН3658СМТС 1989 г. 4 кат.	г. Осиповичи, в/ч 01313	59 000,00	11 800,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **14 января 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 11 января 2021 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **14 января 2021 г. с 9.20 до 10.00.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс (017) 398 05 41.

Да Дня беларускага пісьменства

УТУЛЬНАЙ АТМАСФЕРАЙ, СУЧАСНЫМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ

Чым яшчэ будуць прываблівaць чытачоў у новай бібліятэцы ў Капылі

Жыхары Капыльскага раёна з нецярпеннем чакаюць значнай падзеі ў жыцці рэгіёна — адкрыцця новай дзіцячай бібліятэкі, якая расчыніць дзверы да Дня беларускага пісьменства. Свята адбудзецца ў Капылі ў першыя выхадныя верасня будучага года.

Раней у гэтым будынку месціўся Дом культуры будаўнікоў, які быў не ў найлепшым стане. Яго адрэстаўравалі, абнавілі. Знешнія работы закончаны, вядуцца добраўпарадкаванне тэрыторыі і ўнутранае аздабленне памяшкання.

— Тут будуць дзве асноўныя залы — дамашні абанемент для абслугоўвання дзяцей і іх бацькоў. Нашы кліенты таксама работнікі культуры, усе ахвотныя, у тым ліку і дарослыя. Калі ў іх ёсць такая патрэба, то адмовіць ім не можам, бо мы публічная бібліятэка. У старой бібліятэцы, якую закрылі з прычыны аварыйнасці будынка, нашымі чытачамі былі бацькі, бабулі, дзядулі малых і падлеткаў. Цяпер дзеці выраслі, а яны засталіся нашымі прыхільнікамі. Таму мы камплектуем фонд не толькі дзіцячай літаратурай, але і дарослай. Калі дзеці заняты ў чытальнай зале, то тым, хто іх суправаджае, таксама неабходна нечым заняцца, — кажа **намеснік дырэктара Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі па рабоце з дзецьмі Валянціна КАМІНСКАЯ** і, усміхнуўшыся, дадае: «Чытачы мяне ўспрымаюць па меншай меры, як дырэктара дзіцячай бібліятэкі».

— Ці вялікая ў юных грамадзян прага да чытання? — пацікавілася ў Валянціны Дзмітрыеўны.

— У нас ёсць сур'ёзныя канкурэнты — гаджэты. Не хачу сказаць, што дзеці не чытаюць, але ўжо не такая цікавасць да кніг, як дзесяць гадоў таму. Разам з тым, сярод іх шмат актыўных, цікаўных чытачоў. Яны прачыталі літаральна ўсё, мы нават не ведаем, што ім яшчэ прапанаваць. Таму што камплектаванне літаратурай не такое багатае, як было раней. І нашы юныя чытачы вельмі шчаслівыя, калі атрымліваем новую партыю кніг, — адказвае яна.

Асабліва капыльскія школьнікі цікавяцца творамі расійскага пісьменніка Юрыя Сітнікава, які выступае ў розных жанрах. Яго кнігі разлічаны на самую шырокую аўдыторыю, як для падлеткаў — дэтэктыўныя і прыгодніцкія аповесці, так і для дарослых — сучасная проза з элементамі містыкі. Такія аповесці пра жывёл як «Кот», «Вяртанне Ката», «Калі ў вас няма сабакі», «Гісторыя адной дружбы» адрасаваны чытачам розных узростаў.

Яго кніг у бібліятэцы дзесьці каля трыццаці. Дзеці іх перачыталі. Бібліятэкары атрымалі новую партыю — аж шэсць кніг Сітнікава. Уяўляю якая радасць чакае прыхільнікаў яго творчасці.

— У новай бібліятэцы мы плануем выкарыстоўваць чытальную залу і для арганізацыі масавых мерапрыемстваў. У задумах — шмат цікавага, у тым ліку і шыкоўныя выстаўкі. Мы робім і будзем працягваць рабіць перш за ўсё тое, што прыцягвае і захапляе дзяцей. Яны, сапраўды, вельмі любяць тэматычныя экспазіцыі. Апошняя, якую зладзілі для іх, — з гісторыі гадзіннікаў. На фоне яе малыя фатаграфаваліся, рабілі сэлфі. Мы разумеем, што для сучасных дзяцей трэба больш нагляднасці. Можа нават менш расказваць аб чымсьці, больш паказваць, — канстатуе Валянціна Камінская. — Працягнем практыку анлайн-прэзентацый. Мы падалі заяўку на конкурс і спадзяёмся выйграць грант.

— Мы ўжо нагледзелі тэхніку для абсталявання новай бібліятэкі. Шкада, што не хопіць грошай на інтэрактыўную падлогу, а вось на інтэрактыўны экран магчыма іх дастаткова. Мы маем намер прапагандаваць беларускую гісторыю, мову, айчынную і мясцовую культуру, — падтрымлівае размову **дырэктар цэнтральнай раённай бібліятэкі Алена ПІЛАТ.** — Неабходная ўстанове і новая мэбля, ад старой практычна нічога не засталося, сучасная тэхніка, каб стварыць утульнасць, камфорт для наведвальнікаў. Нам трэба здзівіць іх, каб яны прыйшлі, паглядзелі, якая ў нас цудоўная спрыяльная для чытання, развіцця абстаноўка. А мы ўжо зоймемся імі, будзем старацца затрымаць, прывязаць да нашай бібліятэкі.

Усяго ў раёне 21 бібліятэка, у тым ліку цэнтральная і дзіцячая. Дзіцячая ўстанова шаснаццаць гадоў працуе ў чытальнай зале «дарослай» бібліятэкі. Гэта невялікі куток, дзе змяшчаецца маленькая частка фонду. Астатні захоўвалі то ў гасцініцы, то ў Цэнтры дзіцячай творчасці. Канешне, нязручна было дастаўляць дзецям кнігі. Цяпер асобны пакой адведзены для захавання фонду, дзе падтрымліваецца неабходны мікраклімат.

— Мы запланавалі, што і дзе будзе размяшчацца ў новым будынку, як будзе афармлена кожная зала — прыцягваць дзяцей трэба не толькі цікавымі мерапрыемствамі, аповедамі, але і стварыць для іх утульную атмасферу: мяккія крэслы, дываны, зручныя стэлажы. Дарэчы, старую аварыйную бібліятэку, якую закрылі, вельмі любілі чытачы, прыходзілі дарослыя проста пасядзець, акунуцца ў аўру ўстановы. Пасядзелі — пачыталі, падышлі да стэнда з выстаўкай — карысна ўдвайне. Для дзяцей працаваў экалагічны, гульнявы пакой з дыванамі, мяккімі цацкамі. Усе найлепшыя напрацоўкі перанясём і ў практыку работы новай бібліятэкі. Спадзяёмся, што нам дапаможа ўлада, каб установа культуры не была месцам з сумнымі стэлажамі, — спадзяюцца супрацоўніцы.

На сённяшні дзень кнігі змешчаны ў памяшканні захавання фонду на спецыяльных стэлажах. Гэта амаль трыццаць тысяч экзэмпляраў. Большая частка іх будзе выстаўлена ў залах. «Хочам разгарнуць кнігі тварам да чытача, выгадна іх паказаць. Раней з-за недахопу месца такой магчымасці не было. Гэта вельмі важна для прыцягнення ўвагі кліентаў, тым больш, што цяпер кнігі ярка, маляўніча аформлены. Дзякуй за гэта выдавецтвам».

У планах — папулярызацыя твораў беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку такіх юбіляраў, як Віталь Вольскі, Віктар Гардзей, Ніна Галіноўская. Дзеці цікавяцца таксама творамі айчынных аўтараў, якія выйшлі ў 70-х, 80-х гадах мінулага стагоддзя. «У нас яны захаваліся ў адзінкавых экзэмплярах, і мы іх вельмі беражом», — падкрэслілі мае суразмоўніцы. — А яшчэ ім хочацца, каб больш выдавалася апавяданняў для вучняў. Школьная праграма разлічана на рэальнасць, на запыты дзяцей аб сваіх каранях, продках, малой радзіме, дружбе, вернасці. Таму патрабуюцца жыццёвыя, злабадзённыя творы. Казкі — гэта добра, але часам бацькі скардзяцца, што яны занадта фантасмагарычныя, моцна наварочаныя, адразу і не зразумееш, пра што ідзе размова.

— Гады чатыры таму пачытала апавяданне Алеся Пальчэўскага «Рэкс і Казбек». Параіла перачытаць яго сваім супрацоўнікам. Настолькі захапляльная і карысная кніга — пра сабак. іх вернасць людзям. На маю думку, вось такія творы варта ўключаць у школьную праграму. І нехта мяне пачуў, ужо тры гады гэтае апавяданне ёсць у школьнай праграме па пазакласным чытанні, — радуецца Валянціна Камінская. — Вельмі шмат нам дораць кніг жыхары райцэнтра, вядома, што ў савецкія часы добрыя кнігі былі дэфіцытам, іх можна было набыць толькі па вялікім блаце або ўступіўшы ў таварыства кнігалюбаў. У многіх уладальнікаў яны захаваліся на паліцах, але не ва ўсіх падымаецца рука ад іх пазбавіцца. Аднойчы зайшла да нас жанчына, якая хацела выкінуць кнігі. Але мы ўгаварылі прынесці іх у бібліятэку. Цяпер зноў запатрабаваная серыя раманаў «Гары Потэр» англійскай пісьменніцы Джаан Роўлінг — на іх пайшла новая хваля. Адна з дзяўчынак, наша чытачка, прынесла нам шостую кнігу. Мы ўсе гэтыя творы выставім у новай бібліятэцы і напішам «У дар ад чытача».

Дарэчы, праекціроўшчыкі і будаўнікі паклапаціліся і аб інвалідах-калясачніках — для іх створана безбар'ернае асяроддзе.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Ёсць ідэя!

І ПРАКТЫЧНА, І АРЫГІНАЛЬНА

Маскі з нацыянальным каларытам выраблюць у Маларыцкім цэнтры народнай творчасці

— Мы яшчэ ў першую хвалю эпідэміі зрабілі некалькі сродкаў індывідуальнай аховы. Знайшлі выкрайкі, пашылі галоўным чынам для сябе, — расказала загадчыца цэнтра Валянціна СТРУНЕЦ. — У звычайных медыцынскіх масках, як правіла, дыхаць цяжка. Ну і падумалі тады пра лён як незаменны матэрыял з гаючымі ўласцівасцямі. Вось яго і скарысталі.

Валянціна Мікалаеўна расказала, што для вытворчасці масак яны выкарыстоўваюць у асноўным рэшткі льняной тканіны, што застаюцца ад вырабу касцюмаў. Танюткае палатно, вытканае мясцовымі майстрыхамі, складае ўнутраны слой маскі, зверху яе абшываюць баваўняным палатном з маларыцкім арнаментам. Атрымліваецца і практычна, і арыгінальна, можна дарыць як сувенір. Маска шматразовага выкарыстання, яна добра мыецца.

— Нават самі не чакалі, што такі попыт будзе, — працягвае загадчыца Цэнтра народнай творчасці. — Вось і сёння зайшоў маларытчанін і замовіў пяць штук для падарунка сябрам з Расіі. Некаторыя купляюць менавіта для навагодніх падарункаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з сайта цэнтра.

Юбілей

«БУЛЬВАР, ЯКІ ЧЫТАЕ»

Брэсцкая Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна адзначае 80-годдзе

«За гэты час бібліятэка ніколі не зачынялася для чытачоў, дзейнічала таксама ў гады вайны. Падчас акупацыі была страчана значная частка фонду, але бібліятэка працавала», — нагадаў у сваім тэлеграм-канале старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК. А таксама прывёў цікавыя старонкі з гісторыі бібліятэкі.

У 1971 годзе бібліятэка прымала ўдзел у Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР у Маскве і атрымала званне «Бібліятэка выдатнай работы». У 1993 годзе тут была створана літаратурна-музычная гасцёўня «Берасцейскія сустрэчы», якая паспяхова працуе і цяпер. З 2009 года Дзень горада распачынаецца мерапрыемствам бібліятэкі пад назвай «Бульвар, які чытае». У «Пушкінцы» захоўваюцца ўнікальныя калекцыі краязнаўчых дакументаў, сабраных на працягу 50 гадоў з публікацый у СМІ, і кніг з аўтографамі аўтараў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з тэлеграм-канала

У ПОШУКАХ СТРАЧАНАГА БРЭНДА...

Ці верне Смаргонь былую славу «абараначнай» сталіцы?

Не так даўно давялося пабываць у самым паўночным горадзе Гродзенскай вобласці. Вядома, хацелася даведацца аб найбольш знакавых падзеях і асаблівасцях гэтага края. І такіх тут нямала. У раёне знаходзіцца знакаміты Крэўскі замак, а яшчэ — былая сядзіба кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага. Тут праходзіла лінія фронту падчас Першай сусветнай вайны, дзе ваяваў той самы жаночы батальён, гісторыя якога стала асновай для вядомага кінафільма. А яшчэ тут выпякалі папулярныя смаргонскія «абваранкі», пагалоска аб якіх абляцела ўсё навакольле. Аказваецца, тыя самыя абаранкі, якія мы ўсе любім з самага дзяцінства, бяруць свой пачатак адсюль, са Смаргоні. Але ці засталося што-небудзь ад таго старажытнага промыслу? Таму на пошукі страчанага брэнда і быў скіраваны мой шлях па Смаргоні.

Навуковы супрацоўнік музея Вольга САМАРКІНА.

Відавочна, што ў гэтай справе не абысціся без краязнаўцаў. Таму найперш наведала гісторыка-краязнаўчы музей, што знаходзіцца ў цэнтры горада. Сапраўды, мясцовы «абараначны» летапіс тут ведаюць даволі дасканала. А пачатак свой славутыя «смаргонкі» бяруць у XVII стагоддзі і звязаны яшчэ з адной гарадской асаблівасцю. Месцілася тут, ні больш ні менш, сапраўдная «мядзведжая акадэмія». Так назвалі заснавальнікі Радзівілы «ўстанову» па дрэсіроўцы гэтых драпежнікаў. Як расказала **навуковы супрацоўнік музея Вольга САМАРКІНА**, для «вучобы» карысталіся сухімі хлебнымі кансервамі ў выглядзе палачак. Гэтыя хлябцы дрэсіроўшчыкі бралі для мядзведзяў у падарожжа па гарадах і мястэчках. Гатавалі такія кансервы проста: замешвалі крутое цеста з мукі і вады і варылі яго ў кіпятку. Потым рэзалі на палоскі і выпякалі ў печы. Такі корм і ў дарозе няцяжкі, і лахматым «акадэмікам» падабаўся. Паступова адбылася «рэфармацыя» выпечкі — палачкі сталі скручваць у кругляшы, каб павадырам было зручней насіць іх на вяроўках. І называліся гэтыя вырабы «абваранкі», таму што спачатку варыліся ў кіпені. У хуткім часе рэцэпт удасканалілі і прапанавалі людзям. «Абваранкі» сталі пасыпаць цукрам, дадаваць у цеста мёд, кагор ці мак. А слава смаргонскіх «абваранкаў» была нараўне з «мядзведжай акадэміяй».

З Вольгай Самаркінай падыходзім да імправізаванай печы. Здаецца, перад вачыма праходзіць увесь працэс нялёгкай ручной працы жанчын. Дзве — каля стала замешваюць цеста і паляць у печы, яшчэ па адной — каля печы і катла. Цеста рабілі на рошчыне, усе асноўныя складнікі — мука, вада і дрожджы. Рошчыну потым дабаўлялі ў цеста, каб яно хутчэй падыходзіла.

...Вось жанчыны-каля-стольніцы кладуць кругляшы ў вялікі чыгунны кацёл. Каб «абваранкі» былі бліскучыя і ружовыя, у ваду дабаўляюць яшчэ і мёд. Акрамя мукі, вады і дражджэй, клалі яйкі, цукар, масла, мак, ваніль. Калі кругляшы ўсплылі, іх перакладаюць на бляхі і выпякаюць у вялізнай печы, якую палілі выключна альховымі дровамі. У звычайныя дні пяклі простыя, посныя «абваранкі». А вось на кірмаш — здобныя. Гатовае печыва складалі ў мяхі і нанізвалі на вяроўкі.

Да Першай сусветнай вайны ў горадзе налічвалася каля 60 арцеляў па вытворчасці абвараных кругляшоў. Іх пяклі і вазілі прадаваць на рынкі ў Вільню. Прадавалі нядорага. 5-10 капеек звязка, вялікая баранка — 10 капеек. Савецкая ўлада ўвяла для прыватных вытворцаў вялікія падаткі, і ўсе арцелі аб'яднаў адзін «Харчавік». Затым на змену прыйшоў хлебазавод. Дарэчы, ён і цяпер працуе, гэта філіял Гродзенскага хлебазавода. І тут у асартыменце таксама ёсць абаранкі. Але больш вядомыя смаргонскія сушкі некалькіх відаў. З задавальненнем іх пакаштавала.

Аб папулярнасці абаранкаў за межамі Беларусі пісаў у XIX стагоддзі вядомы беларускі этнограф Адам Кіркор. Маўляў, у Смаргоні Ашмянскага павета Віленскай губерні амаль усё мяшчанскае насельніцтва займаецца выпечкай маленькіх абаранкаў, ці крэндзялькоў, якія набылі вялікую вядомасць пад назвай «смаргонскіх абваранкаў». Ён сцвярджаў, што літаральна ўсе вандроўнікі абавязкова купляюць некалькі звязак. Магчыма, і сучасныя турысты не адмовіліся б пакаштаваць сапраўдных «смаргонак», прыгатаваных па даўнейшых рэцэптах. Аказалася, пытанне ў тым, як наладзіць падобны промысел.

— Каб наладзіць вытворчасць, трэба шэраг дазволаў, атрымаць іх няпроста і па санітарным стане і па лініі МНС, — расказвае Вольга Самаркіна. — Таму пакуль мы можам гэта зрабіць толькі ў тэатральнай форме. Праводзім тэматычныя экскурсіі. Частуем смаргонскімі сушкамі.

Дык няўжо знакаміты брэнд так і застанецца ў мінулым? Відавочна, што адраджэнне промыслу важнае і для турыстычнага патэнцыялу рэгіёна. Вядома, у краязнаўцаў ёсць жаданне аднавіць старажытны промысел. Хоць бы дэманстраваць майстар-клас для турыстаў. І памяшканне для гэтага ёсць. Нават была ідэя адкрыць міні-пякарню. З гэтай мэтай спецыялісты музея азнаёміліся з работай такой пякарні ў суседзяў-палякаў. Напрыклад, у Кракаве такая выпечка карыстаецца вялікім попытам у мясцовых жыхароў і турыстаў, нават мае свой фірменны знак.

Аб такой вытворчасці мараць і смаргонскія краязнаўцы. Яны нават прадставілі свой праект у праграму трансгранічнага супрацоўніцтва, але пакуль не атрымалі адказу. Таму работнікі музея самі шукаюць магчымасць зладзіць такі праект.

— Абаранкі — беларускае нацыянальнае вынаходніцтва, Смаргонь — іх сталіца. Таму тут трэба зладзіць былую вытворчасць і частаваць турыстаў, — лічыць Вольга Самаркіна.

У аддзеле культуры Смаргонскага райвыканкама паведамілі, што пэўныя захады для адраджэння былога брэнда робяцца. У 2017 годзе ўпершыню прайшоў фестываль-кірмаш «Смаргонскія абаранкі». Шырока святкавалі яго і летась. Праўда, наколькі ідэя атрымае працяг у перспектыве, невядома.

— Цяпер пакуль усё спынена, многае, што планавалі правесці, не адбылося. Меркавалі, што музей зможа набыць па праекце патрэбнае абсталяванне, каб выпякаць абаранкі. Але пакуль гэта тэма спынілася. Таму анансаваць крокі па адраджэнні промыслу пакуль рана, але ідэя, вядома, ёсць, — растлумачыла **начальнік аддзела культуры Таццяна РАЖАВА.**

Загадчыца аддзела культуры і вольнага часу Вішнеўскага дома культуры Ала ДЫРО знайшла ў сваёй вёсцы жанчыну, якая гатавала абаранкі па рэцэпце сваёй свекрыві.

— У Вішневе жыве Ядвіга Фларыянаўна Хадалёнак, ёй нядаўна споўнілася 78 гадоў, — расказвае Ала Лявонаўна. — Яна ўвогуле вялікая майстрыха — і швачка, і вышывальшчыца, і ткачыха, і кулінарка. Вось яна пагадзілася паказаць на свяце майстар-клас і выпечы абаранкі. Свята было вельмі шматлюднае, і яе абаранкі вельмі спадабаліся, многіх яна частавала.

Да папулярызацыі брэнда Ала Лявонаўна ставіцца вельмі станоўча. Яна ўпэўнена, што «Свята абаранка» будзе працягвацца і надалей. Што датычыцца адкрыцця майстар-класа, справа гэта складаная з-за таго, што патрэбна руская печ. І ўсё ж нават пры сучасным абсталяванні сам працэс абварвання і выпечкі таксама цікавы. Асабліва, калі ёсць магчымасць яшчэ і пакаштаваць. Міні-пякарня магла б узяць на сябе такі эксклюзіўны кірунак.

Увогуле, нічога асаблівага ў выпечцы абаранкаў няма, запэўніла кулінарка Ядвіга Хадалёнак. Для цеста патрэбныя самыя звычайныя інгрэдыенты — вада, дрожджы, мука, цукар, масла і крыху малака. Менавіта з такога цеста выпякалі абаранкі ў яе сям'і. Рабілі гэта звычайна на святы. Ядвіга Фларыянаўна прызналася, што і цяпер вельмі любіць абаранкі. Яна купляе гатовыя, намочвае іх у вадзе, кладзе на бляху, а дзірку запаўняе начынкай — розным фаршам альбо тварагом з ягадамі. Зверху змазвае яйкам. Вось такі ўдасканалены рэцэпт старажытнага промыслу ад Ядвігі Фларыянаўны атрымала ў выніку знаёмства.

Увогуле, гэты пласт заслугоўвае таго, каб яго ўнесці і ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. У раённым цэнтры культуры, такую магчымасць не выключаюць. Але для разгляду заяўкі патрэбны менавіта носьбіты гэтай справы. Каб прадукт гатаваўся жанчынай па ўсіх правілах — з рускай печкай, чыгунным катлом, металічнымі бляхамі — і па старых рэцэптах. Пакуль дасканала ўзнавіць гэты працэс не ўдалося. Але ў Смаргоні спадзяюцца на поспех. Нездарма ў гэтым кірунку зроблены важны крок — зацверджаны брэндавы фестываль «Свята абаранка». Чарговы, трэці

Каробкі з абаранкамі.

па ліку, кірмаш плануецца правесці налета.

Пакідаючы Смаргонь, прайшлася па цэнтры горада. Раз-пораз на вочы траплялі каменныя скульптуры і металічныя інсталяцыі. Падумала, што не хапае тут скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай знакамітым смаргонскім абаранкам-«абваранкам». Добрая атрымалася б фотазона...

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

У тэму

У Смаргоні расказалі яшчэ і рэцэпт прыгатавання **сушак.** Для выпечкі патрэбны: бляшанка згушчонага малака, 2 яйкі, пачак ванільнага цукру, крыху солі, 50 грамаў масла альбо маргарыну, паўчайнай лыжкі соды, каля 600 г мукі. Яшчэ жаўток, крыху малака і маку. У місцы перамяшаць яйкі, згушчонку, ванільны цукар, соль і масла. У муку дадаць соду і замясіць цеста. Яно павінна быць не тугое, але і не занадта мяккае, нават крыху ліпкае. Раскатаць жгуцікі таўшчынёй у сантыметр. Надаць форму абаранка. Абмакнуць верх у сумесь жаўтка, малака і маку. Пакласці на бляху з паперай для выпечкі, выпякаць мінут 12—15 да залацістага колеру.

КРОЎ НЕІСНУЮЧАЙ МОВЫ

Пяць нечаканых фактаў пра фільм «Урокі фарсі», які вылучаны ад Беларусі на «Оскар»

Калі сакратарка амерыканскай кінаакадэміі ўпершыню ўзяла ў рукі статуэтку, якой узнагароджвалі лаўрэатаў прэміі згаданай кінаакадэміі, яна ўсклікнула нешта накшталт «Выліты мой дзядзька Оскар!»

Так прыз атрымаў імя, а спісы тых, хто за прызам выстройваўся ў чаргу, сталі нагадваць астранамічны атлас — зоркі, зоркі, зоркі...

Беларусы таксама хочуць мець «Оскар»... Хто ж яго не хоча. Апошнія гады мы нават траплялі ў прэміяльную чаргу. У 2018-м у намінацыі «Найлепшы замежны фільм» засвяціўся «Крышталь» Дар'і Жук, у 2019-м — дакументалка «Дэбют» Настассі Мірашнічэнкі. Сёлета Беларусь прадстаўляе стужка «Урокі фарсі», якая ўжо засвяцілася на Берлінале і маскоўскім кінафестывалі, і каб не пандэмія, заявілася б яшчэ на дзясятках кінафестываляў свету і сабрала гледачоў у кінатэатрах... Дабротны плён супрадукцыі Расіі, Германіі і Беларусі. Здымаў фільм амерыканскі рэжысёр, які нарадзіўся ва Украіне, Вадзім Перэльман. Здымкі адбываліся ў Беларусі. Сюжэт — той, які змушае параўноўваць з такімі сусветна вядомымі фільмамі, як «Спіс Шындлера», «Піяніст», «Жыццё цудоўнае». Халакост. Фашызм. Ахвяры і каты. Чалавечнасць і бесчалавечнасць. І пытанне гістарычнай памяці, якое для беларусаў актуальнае надзвычай.

Што ж, давайце згадаем, чым адметная гэтая стужка.

1. СЦЭНАРЫСТ ЗНАЙШОЎ СЮЖЭТ У ПЯТНАЦЦАЦІГАДОВЫМ УЗРОСЦЕ

Ілья Цофін, расійскі сцэнарыст, расказвае, што сюжэт для гэтага фільма ён знайшоў, яшчэ калі яму было пятнаццаць гадоў. Чытаў нейкі савецкі часопіс — нават дакладна не згадае, які, магчыма, «Вокруг света». Там і прачытаў аповед пра яўрэя, вязня фашысцкага канцлагера, які, каб ацалець, выдаў сябе за перса і вучыў аднаго са сваіх ахоўнікаў персідскай мове, сам яе не ведаючы, выдумляючы на хаду. Гісторыя тая ўрэзалася ў памяць, герой выклікаў захапленне — трэба быць амаль геніем, каб вось так прыдумляць праўдападобна мову, трымаць у памяці словы і правілы, каб цябе не выкрылі...

Прайшоў час, і ўжо вядомы сцэнарыст Ілья Цофін напісаў сцэнарый на той сюжэт. Ім зацікавіўся вядомы прадзюсар і рэжысёр Цімур Бекмамбетаў, які ўзяўся за перамовы са студыямі. Аднак, як расказаў Цофін берлінскаму радыё, вядомая кінастудыя паставіла ўмову: трэба прадставіць доказы, што ў аснове — сапраўдная гісторыя! Сцэнарыст пералапаціў у маскоўскай «Ленінцы» ўсе падшыўкі савецкіх часопісаў. Не знайшоў тую публікацыю, што запала ў памяць у падлеткавым узросце. Наняў чалавека, які працягнуў пошукі — дарэмна. А потым высветлілася, што ў гісторыі літаратурнае паходжанне — а менавіта пераказ апавядання пісьменніка з ГДР Вольфганга Кальхаазэ «Вынаходніцтва мовы», які часам можна сустрэць пад назвай «Персідская для капо». Аўтарскія правы былі набытыя, але прытым Кальхаазэ сцвярджаў, што ў аснове яго апавядання якраз рэальная гісторыя!

Цофін надаў сюжэту каларыту. Бельгійскага яўрэя Жыля Крэм'ё разам з іншымі ахвярамі вязуць у грузавіку да месца расстрэлу. У машыне адзін з таварышаў па няшчасці выменьвае ў яго бутэрброд на кніжку персідскіх казак. Менавіта гэтая кніжка выратуе Жылю жыццё — як пацвярджэнне, што ён, смуглявы і вачасты, не яўрэй, а перс. А загадчыку «харчовай часткі» ў канцлагеры кухару Клаўсу Коху якраз спатрэбіўся настаўнік фарсі — Клаўс марыць адкрыць рэстаран у Тэгеране.

2. МЕСЦАМІ ЗДЫМАК БЫЛІ БАБРУЙСКАЯ КРЭПАСЦЬ І МІКАШЭВІЦКІ КАР'ЕР

Назва канцлагера, дзе адбываецца дзеянне, у фільме вельмі ўмоўная — «Jedem das siene», у перакладзе «Кожнаму сваё». А канкрэтнае месца застаецца на сімвалічным узроўні, «дзесьці ў Еўропе», то-бок усё магло адбыцца дзе заўгодна. Але здымкі адбываліся ў асноўным у Бабруйску, і мясцовыя жыхары занятыя там у масавых сцэнах. База для акцёраў масоўкі знаходзілася ў адным з карпусоў Бабруйскай крэпасці. Бабруйчане на нейкі час ператвараліся ў вязняў з жоўтымі зоркамі на грудзях і канваіраў, да іх далучаліся жыхары Мінска, Асіповіч, Жлобіна, якія таксама хацелі ўзяць удзел у здымках... Асобныя сцэны здымалі ў лесе каля вёскі Думаноўшчына. Былі і здымкі ў кар'еры ў Мікашэвічах, які належыць прадпрыемству «Граніт». Там, дарэчы, увогуле любяць здымаць фільмы — атмасферна, жывапісна... Глыбіня за сотню метраў, скалы, камяні, вадаспады. Як не ў Беларусі. Тут «вязні канцлагера» працавалі, сноўдалі з тачкамі ды кайламі. Дарэчы, кажуць, што выкарыстаныя падчас здымак дэкарацыі можна пабачыць і сёння, у Бабруйскай крэпасці — яны былі падораныя гораду.

3. ДЛЯ ФІЛЬМА ПРЫДУМАЛІ САПРАЎДНУЮ АСОБНУЮ МОВУ, ЗАСНАВАНУЮ НА ІМЁНАХ АХВЯР ХАЛАКОСТУ

А вось тое, што выводзіць фільм за рамкі жанру і ператварае ў, лічыце, філасофскі праект — гэта тое, што для яго адмыслова стварылі неіснуючую мову, фэйк-фарсі.

Усе ведаюць эсперанта, прыдуманую польскім акулістам Заменгофам. Але ёсць у гісторыі выдуманыя мовы, якія выдаваліся за існуючыя, — такая мова называецца канланг. У XVIII стагоддзі жыў авантурыст Джордж Салманазар, які выдаваў сябе за ўраджэнца вострава Фармоза — Тайваня. Яго нават Оксфардскі ўніверсітэт наняў, каб той перакладаў на фармозскую мову (якой Салманазар не ведаў) рэлігійную літаратуру. І перакладаў жа! У сеціве можна знайсці малітву «Ойча наш» на фармозскай мове ў перакладзе Салманазара. Самы вядомы, аднак, вынаходнік неіснуючых моў — аўтар кніг пра хобітаў і эльфаў Толкіен. Ён, дасведчаны лінгвіст, для свайго літаратурнага праекта прыдумаў 15 моў, на якіх размаўляюць народы фэнтэзійнага Сяродзем'я. Дзве з іх, квенья і сіндарын, мову эльфаў, прафесар Толкіен распрацаваў настолькі, што і сёння можна іх вывучыць і кантактаваць на іх з такімі ж «талкіенутымі». Бероўз прыдумаў мову малпаў мангані, на якой гаворыць Тарзан. Рычардс Адамс у казачнай аповесці «Насельнікі пагоркаў» распрацаваў для сваіх герояў мову «лапн», у Джонатана Свіфта Гулівер у краіне веліканаў мусіць засвоіць мясцовую мову «гуігнгнм», у якой няма слоў, якія пазначаюць чалавечыя недахопы. ...Толкіен, дарэчы, у 1931 годзе падрыхтаваў даклад пра тое, як правільна канструяваць мовы. Трэба захаваць тры неабходныя пункты. Мове патрэбна гісторыя. Мова павінна быць эстэтычна прыемная на слых. Мове патрэбна граматыка.

Стваральнікі фільма аднесліся да стварэння псеўда-персідскай з энтузіязмам. Быў наняты малады лінгвіст з МДУ Антон Кіраў, які распрацаваў фэйк-фарсі па ўсіх правілах. Там ёсць граматыка, арфаграфія, слоўнік з шасцісот слоў. Праўда, у фільме гучыць, што пад кіраўніцтвам Жыля Кох вывучыў дзве з паловай тысячы слоў фэйк-фарсі. Менавіта на тэрыторыі штучнай мовы кухар канцлагера і вязень могуць выйсці за свае ролі. Кох піша на фэйк-фарсі вершы. «Я цябе кахаю» на гэтай мове гучыць як «Или бар онай ау».

А яшчэ ўразлівая дэталь: для стварэння мовы Жыль выкарыстоўвае імёны вязняў канцлагера са сшытка ўліку, які даручылі яму весці. Такім чынам ператварае штучную мову ў агромністы мемарыял. І ў канцы, калі з дапамогай Коха яму ўдаецца ўцячы і патрапіць да антыфашыстаў і ў яго пытаюцца, ці памятае ён імёны кагось з ахвяр лагера, Жыль адказвае, што памятае 2840 імёнаў. Увесь слоўнік псеўдаперсідскай.

І ў жыцці рэжысёр таксама здзейсніў такі мемарыял, прапанаваўшы лінгвісту выкарыстаць пры прыдумванні слоў рэальны спіс імёнаў ахвяр Халакосту. Гэта ўжо Борхесаўскія канструкцыі: пакуль Клаўс Кох верыць, што ведае фарсі і будзе на ёй размаўляць, будуць гучаць імёны забітых.

4. РЭЖЫСЁР ВЫПАДКОВА ЗЛАВІЎ БАБРУЙСКІ ТУМАН

Жыхары Беларусі, якія прымалі ўдзел у здымках, з нецярплівасцю чакалі масавага пракату фільма, нягледзячы на перашкоды пандэміі, каб пазнаць сябе ва ўражальных кадрах. Пазнаецца там і прырода Беларусі... Хоць часам гэта зрабіць цяжка, дзякуючы «магічнаму крышталю» мастацтва. Напрыклад, ёсць у фільме сцэна, калі Жыль у суправаджэнні лагернага канваіра выходзіць выкідваць смецце, а ўсё засцілае амаль сюррэалістычны туман. Калі Вадзіма Перэльмана ў «Российской газете» спыталі, якім чынам яму ўдалося дамагчыся такога эфекту, той адказаў: «Гэта ўвогуле быў цуд. Мы здымалі ў Бабруйску, і ў нас на гэты дзень былі прызначаныя іншыя здымкі. На кухні. Пакуль усе да іх рыхтаваліся, я выйшаў пакурыць. Паглядзеў на гэтую дарогу. А там за дрэвамі метраў 20 пабудовы — гаражы «саўковыя», якія захаваліся яшчэ з 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Аранжавыя, чырвоныя — мы туды камеру нават не скіроўвалі, стараліся не глядзець. І вось я выходжу, гляджу... і ачмурэў нават. Хутка пабег да рацыі: «Усіх — сюды! Камеру — сюды! Дзе бочка?» Бочка з адкідамі ўвогуле не павінна была быць у кадры ў гэты дзень. Я кажу: «Хуценька яе збірайце, колы трэба прыкруціць. Усё зараз сыдзе!» Касцюмы таксама былі іншыя... Усе забегалі. Гэта быў пачатак змены — гадзін 7-8 раніцы. Да 10-11 мы ўсё адзнялі. І звычайна гэты туман развейваецца сонцам. Але ён стаяў увесь дзень. І мы тады знялі яшчэ і абедзве сцэны на пляцы — калі раніцай ходзяць жаўнеры».

«Вельмі пашанцавала» — так апісвае рэжысёр свой раман з бабруйскім туманам.

5. СЦЭНАРЫЙ НАПІСАЛІ НА РУСКАЙ МОВЕ, ПЕРАКЛАЛІ НА АНГЛІЙСКУЮ, НА ПЛЯЦОЎЦЫ КАРЫСТАЛІСЯ НЯМЕЦКАЙ

Моўнае пытанне і захаванне гістарычнай памяці — балючыя і актуальныя для беларусаў ва ўсе часы. Колькі разоў нас змушалі не быць сабою, беларускую мову прыхоўвалі, саромеліся ці баяліся ёю карыстацца... З другога боку, тут, на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў, сустракаліся культуры і канфесіі, ужываліся ў адных месцах і мястэчках. Гэткая мультыкультурнасць утварылася і на здымачнай пляцоўцы «Урокаў фарсі». Як ужо згадвалася, фільм — праект трох краін, а рэжысёр — амерыканец украінскага паходжання. Аператар Уладзіслаў Апельянц — з Расіі, выканаўца ролі Жыля Наўэль Перэс Біскаярт — аргенцінец, выканаўца ролі Коха — немец Ларс Айдынгер. Сцэнарый Ілья Цофін адпачатку напісаў на рускай мове. Пасля быў перакладзены на англійскую. Але на здымачнай пляцоўцы карысталіся ў асноўным нямецкай мовай. Пра прысутнасць фарсі ведаем. Асноўная тэма — Халакост, лёсы яўрэяў. Але Вадзім Перэльман сцвярджае, што фільм — пра ўзаемадзеянне паміж людзьмі і давер.

А яшчэ стваральнікі фільма хацелі, каб кожны глядач запомніў хоць адно слова выдуманай Жылем мовы — і тым далучыўся да вяртання памяці.

Што ж, нам застаецца чакаць. 93-я цырымонія ўручэння прэміі «Оскар» адбудзецца 25 красавіка наступнага года.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Черметремонт»** (УНП 600068756), 223017, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, в лице антикризисного управляющего ООО «Антикризисное управление», тел. +375 (17) 348-37-29.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **12 января 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС	Затраты по торгам, бел. руб. с НДС
1	Бортовой тентовый ГАЗ-330232, 2008 г. в., гос. номер АЕ 7642-5, отсутствует ключ, техпаспорт	2 600,00	58,12
2	Грузопассажирский вагон GAZ 2705, 2009 г. в., гос. номер АІ 2221-5	2 300,00	51,41
3	Грузовой бортовой MAZ-5336 А3, 2009 г. в., гос. номер АІ 3313-5	4 500,00	100,59
4	Полуприцеп бортовой МТМ-93301, 2004 г. в., гос. номер 0038 АА-5	1 200,00	26,82

Местонахождение – п. 1 – Минская обл. Минский р-он, аг. Гатово, Новодворский с/с, пп. 2–4 – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.12.2020 г. 09.00 по 11.01.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Утерянные представительством Белгосстраха по Узденскому району БСО формы 1СУ квитанции о приеме страховых взносов от населения серии ВА №№ 1540591–1540599 в количестве 9 шт. **считать недействительными.**

УНП 100122726

Президиумом Минского городского комитета Минской городской организации Белорусского профессионального союза работников торговли, потребительской кооперации и предпринимательства принято решение от 26.11.2020 № 204 «О ликвидации первичной профсоюзной организации Общества с ограниченной ответственностью «Белинтерпродукт»

УНП 102386649

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703

Продавец: ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона, который состоится 21.12.2020

Лот № 1 – изолированные помещения, реализуемые одним лотом. Местоположение: **Витебская обл., г. Витебск, ул. Советская, д. 10А**

Административное помещение, общ. пл. **134,7 кв. м,** инв. № **200/D-92645**
Административное помещение, общ. пл. **134,7 кв. м,** инв. № **200/D-92653**
Административное помещение, общ. пл. **134,3 кв. м,** инв. № **200/D-92656**
Изолированные помещения находятся в капитальном строении с инвентарным номером 200/С-44742, расположенном на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000278 (право постоянного пользования), 0,0637 га

Обременение: аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 490 800,00 бел. руб.

Дата и время проведения аукциона по лоту № 1 – 21.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
Дата и время окончания приема документов – 17.12.2020 до 17.00 по тому же адресу

Предмет аукциона, который состоится 22.12.2020

Местоположение **торговых помещений**: **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район д. Озерцо, Менковский тракт, 2**

№ лота	Наименование	Общая площадь	Инв. номер	Адрес (номер дома/ пом.)
1	Изолированное помещение № 450	12,1 кв. м	600/D-64265	2-450
	Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
2	Изолированное помещение № 440	12,1 кв. м	600/D-64279	2-440
	Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
3	Изолированное помещение № 441	12,1 кв. м	600/D-64280	2-441
	Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
4	Изолированное помещение № 436	12,1 кв. м	600/D-64291	2-436
	Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
5	Изолированное помещение № 437	12,1 кв. м	600/D-64302	2-437
	Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб			
6	Изолированное помещение № 438	12,0 кв. м	600/D-64303	2-438
	Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
7	Изолированное помещение № 439	12,0 кв. м	600/D-64304	2-439
	Начальная цена лота № 7 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
8	Изолированное помещение № 435	12,5 кв. м	600/D-64306	2-435
	Начальная цена лота № 8 с НДС 20 % – 13 381,46 бел. руб.			
9	Изолированное помещение № 443	12,1 кв. м	600/D-64309	2-443
	Начальная цена лота № 9 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
10	Изолированное помещение № 442	12,1 кв. м	600/D-64310	2-442
	Начальная цена лота № 10 с НДС 20 % – 12 812,04 бел. руб.			
11	Изолированное помещение № 681	11,4 кв. м	600/D-64373	2-681
	Начальная цена лота № 11 с НДС 20 % – 11 957,90 бел. руб.			
12	Изолированное помещение № 549	17,0 кв. м	600/D-64448	2-549
	Начальная цена лота № 12 с НДС 20 % – 18 506,28 бел. руб.			
13	Изолированное помещение № 572	22,5 кв. м	600/D-64493	2-572
	Начальная цена лота № 13 с НДС 20 % – 24 200,52 бел. руб.			
14	Изолированное помещение № 579	18,5 кв. м	600/D-64568	2-579
	Начальная цена лота № 14 с НДС 20 % – 20 214,55 бел. руб.			
15	Изолированное помещение № 604	11,2 кв. м	600/D-64641	2-604
	Начальная цена лота № 15 с НДС 20 % – 11 673,19 бел. руб.			
16	Изолированное помещение № 663	11,7 кв. м	600/D-64659	2-663
	Начальная цена лота № 16 с НДС 20 % – 12 242,62 бел. руб.			
17	Изолированное помещение № 605	11,3 кв. м	600/D-64683	2-605
	Начальная цена лота № 17 с НДС 20 % – 11 957,90 бел. руб.			
18	Изолированное помещение № 606	11,2 кв. м	600/D-64690	2-606
	Начальная цена лота № 18 с НДС 20 % – 11 673,19 бел. руб.			
19	Изолированное помещение № 617	11,3 кв. м	600/D-64768	2-617
	Начальная цена лота № 19 с НДС 20 % – 11 957,90 бел. руб.			
20	Изолированное помещение № 618	11,3 кв. м	600/D-64771	2-618
	Начальная цена лота № 20 с НДС 20 % – 11 957,90 бел. руб.			
21	Изолированное помещение № 620	10,9 кв. м	600/D-64774	2-620
	Начальная цена лота № 21 с НДС 20 % – 11 388,48 бел. руб.			

Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1–21 – 22.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
Дата и время окончания приема документов – 18.12.2020 до 17.00 по тому же адресу

Предмет аукциона, который состоится 24.12.2020

Местоположение: **Гомельская обл., г. Светлогорск, м-н Березина, 29**

№ лота	Наименование	Общая площадь	Инв. номер	Адрес (номер дома/ кварт.)
1	**Квартира № 1** (число комнат – 2)	**56,7 кв. м**	**342/D-93228**	**29-1**
	Начальная цена лота № 1 без НДС – 46 600,00 бел. руб.			
2	**Квартира № 2** (число комнат – 2)	**59,3 кв. м**	**342/D-93248**	**29-2**
	Начальная цена лота № 2 без НДС – 48 900,00 бел. руб.			
3	**Квартира № 4** (число комнат – 2)	**60,0 кв. м**	**342/D-93250**	**29-4**
	Начальная цена лота № 3 без НДС – 49 400,00 бел. руб.			
4	**Квартира № 5** (число комнат – 2)	**57,2 кв. м**	**342/D-93251**	**29-5**
	Начальная цена лота № 4 без НДС – 47 000,00 бел. руб.			
5	**Квартира № 12** (число комнат – 2)	**59,3 кв. м**	**342/D-93288**	**29-12**
	Начальная цена лота № 5 без НДС – 48 900,00 бел. руб.			

Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1–5 – 24.12.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
Дата и время окончания приема документов – 22.12.2020 до 17.00 по тому же адресу

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) – обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 13.10.2020 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.** **E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ГЛХУ «Червенский лесхоз», 223232, ул. Барыкина, 16, г. Червень, Минская обл., +3751714 52384**

Предмет аукциона:
транспортные средства, спецтехника, бывшие в употреблении
Месторасположение:
Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье»

Лот №	Инв. номер	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1	01244289 01244716	Автомобиль грузовой специальный сортиментовоз МАЗ-6303А8 (рег. знак АЕ 9558-5) 2008 г.в. с гидроманипулятором М-75.04	**10 475,22**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счёт BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка – по 21.12.2020 г.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by/ru/) 18.09.2020

Дата и время проведения аукциона: 23.12.2020 в 11.00 по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье».
Дата и время окончания приема документов: 21.12.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 400/D-205963 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 335,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, 4-2, р-н д. Заболоть.
ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422088000001000047 (назначение – земельный участок для обслуживания административного здания), площадью 0,0652 га по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, 4, р-н д. Заболоть (доля в праве 83/100). Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0013 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, код – 5.4, площадью 0,0011 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код 5.5, площадью 0,0011 га; земельные участки, расположенные в пределах территорий перспективного развития населенных пунктов, код – 11, площадью 0,0652 га.
Начальная цена продажи – 98 400 руб. (девяносто восемь тысяч четыреста рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 9 840 (девять тысяч восемьсот сорок рублей)

ЛОТ 2: изолированное помещение, инв. № 400/D-208686 (назначение – административное помещение, наименование – административно-хозяйственное помещение), площадью 108,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, 2А-1, р-н д. Заболоть.
ЛОТ 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422088002701000039 (назначение – земельный участок для обслуживания здания учебного корпуса), площадью 0,0834 га по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, 2А, р-н д. Заболоть. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне электропередачи, код – 13.2, площадью 0,0236 га. На земельном участке расположены изолированные помещения (в рамках капитального строения), не подлежащие продаже. Выделение земельного участка будет осуществляться после продажи изолированного помещения в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Начальная цена продажи – 22 620 руб. (двадцать две тысячи шестьсот двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 262 (две тысячи двести шестьдесят два рубля)

Продавец – Учебно-опытный сельскохозяйственный производственный кооператив «Путришки», 231750, Гродненский р-н, аг. Путришки, ул. Тарханова, 49. Тел./факс 8-0152-715-166

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 22 декабря 2020 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.07.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 18 декабря 2020 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46

Продавец: ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61

Предмет аукциона

Лот №	Наименование, назначение	Общ. пл.	Инв. номер
1	**Машино-место № 20,** по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 1-132	13,2 кв. м	500/D-708120687
	Начальная цена с НДС 20 %	**17 775,72 бел. руб.**	
	Сумма задатка	**1 400,00 бел. руб.**	
2	**Машино-место № 38,** по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 1-150	13,9 кв. м	500/D-708120690
	Начальная цена с НДС 20 %	**18 658,94 бел. руб.**	
	Сумма задатка	**1 500,00 бел. руб.**	
3	**Машино-место № 36,** по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 1-148	13,7 кв. м	500/D-708120688
	Начальная цена с НДС 20 %	**18 438,17 бел. руб.**	
	Сумма задатка	**1 500,00 бел. руб.**	

Обременение: аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона.

Задаток перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок заключения договора купли-продажи: 20 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведение аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.10.2020

Дата и время проведения аукциона	**22.12.2020 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**18.12.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Медыяпрастора

«ЧАСОПІС — ГЭТА ЛАБАРАТОРЫЯ, А КНІГАВЫДАННЕ — ШЫРОКАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ»

У 1926 годзе, да пяцігадовага юбілею часопіса «Полымя» Якуб Колас напісаў верш-віншаванне, у якім прыпадабняў гэта беларускі літаратурны часопіс агменю, убачанаму на дарозе праз цемру:

«І раптам — блісь агонь здалёк!
З душы апаў страхоцця мрок,
І зніклі чары чорнай здрады
І шэпты воражай нарады:
Мне песню сонечнай прынады
Спявае ў цьме той аганёк!
Гары ж і «Полымем» чырвоным
Шугні, агонь,
І цемрадзь-сонь
Развей, згані ад краю ў край,
Іскрыся іскрамі, палай!»

Пайшло ўжо другое стагоддзе ад нараджэння аднаго са старэйшых беларускіх выданняў. Чым сёння жыве часопіс, якімі «іскрамі іскрыцца»? Пра гэта мы гутарым з яго галоўным рэдактарам Аленай МАЛЬЧЭЎСКАЙ.

— «Тоўсты часопіс» — гэта замацаванае часам азначэнне, якое выклікала традыцыйна піетэт... Сёння часопісы «худзеюць» і ўвогуле знікаюць з матэрыяльнага свету, пераходзячы ў віртуальны стан... «Полымя» па-ранейшаму замахваецца на буйныя формы — раманы, паэмы? Наколькі іх часопісныя варыянты канкуруюць з кніжнымі?

— Па-першае, трэба заўважыць, што літаратурныя жанры таксама змяняюцца. Згадайце, як піша Юрый Алеша пра прозу ў сярэдзіне XX стагоддзя ў кнізе «Ни дня без строчки»: «Размышление или воспоминание в двадцать или тридцать строк, максимально, скажем, в сто строк — это и есть современный роман» ці «Книги читаются сейчас в перерывах — в метро, даже на его эскалаторах — для чего ж тогда книге быть большой? Я не могу себе представить долгого читателя — на весь вечер». А што тады казаць пра сучаснасць, якая стала яшчэ больш імклівай? Так што пэўныя змены і часопісаў, і літаратурных жанраў — гэта натуральная хада часу. Прычым, хада па коле. Бо цікавасць да лонгрыдаў, да серыялаў пераконвае, што буйныя формы ў мастацтве ў прынцыпе нікуды не знікнуць. Што датычыцца менавіта палымянскіх публікацый, то так, мы сёння вельмі часта звяртаемся да ўрыўкаў і часопісных варыянтаў, каб мець магчымасць больш шырока прадстаўляць чытачу літаратурны працэс на 144 старонках на месяц. Ніякай канкурэнцыі з кнігамі, якія пасля выходзяць, тут няма. Я лічу, што гэта, наадварот, сімбіёз. Зацікавіўшыся канкрэтным творам ці творчасцю аўтара ўвогуле, чытач пасля часопіснай публікацыі звяртаецца да кніжных выданняў.

— «Полымя» — гэта яшчэ і выданне, дзе друкуюцца «дакументы часу» — мемуары, успаміны, дзённікі, гістарычныя расследаванні... Якія сенсацыі чакаюць чытача ў найбліжэйшых нумарах?

— У № 11 2020 года да юбілею Андрэя Макаёнка ў нас выйшаў унікальны матэрыял. Дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Ганна Запартыка на аснове архіўных дакументаў — пратакола пасяджэння драматычнай секцыі Саюза пісьменнікаў — напісала пра першую сустрэчу драматурга з тэатрам і яго п'есу «На досвітку». Шмат увагі мы сёння звяртаем і на мала асэнсаваныя 1990-я. У № 3 да 100-годдзя Купалаўскага тэатра ў нас выйшаў, здаецца, не апублікаваны да гэтага тэкст з архіва тэатра, знойдзены і падрыхтаваны Вольгай Бабковай. На пачатку 90-х тагачасны загадчык літаратурна-драматургічнай часткі, крытык, сцэнарыст Ванкарэм Нікіфаровіч напісаў артыкул «Названы імем Купалы» — развагі пра мінулае і сучаснасць не толькі тэатра, але ж і краіны. А ў № 1 2021 года мы анансуем публікацыю дзённікаў пачатку 1990-х выбітнага беларускага тэкстолага, літаратуразнаўцы, акадэміка Міхася Мушынскага, якія падрыхтавала яго дачка, пісьменніца і крытык Таццяна Мушынская. У іх знайшлося месца і асабістаму, і рабочаму. Зафіксавана шмат рэалій — напрыклад, тагачасныя цэны. Ну і канечне, гэта ў пэўным сэнсе летапіс жыцця Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі.

— І як вы расцэньваеце публікацыю скандальных дзённікаў, у якіх процьма людзей і падзей апісваецца дужа суб'ектыўна — магчыма, варта іх друкаваць з каментарыямі? Як ставіцеся да купюр у падобных дакументах?

— А што такое скандальны? Што мы маем на ўвазе пад гэтым азначэннем? Толькі суб'ектыўнасць апісання? Мне падаецца, што не існуе агульнага рэцэпта для нейкага абстрактнага скандальнага дзённіка. Кожная сітуацыя патрабуе свайго ўнікальнага рашэння ў залежнасці ад процьмы акалічнасцяў.

— Апошнія гады часопісы прывабліваюць чытачоў тэматычнымі нумарамі... Ці чакаюцца такія ў «Полымі»?

— Пакуль пра гэта казаць рана, але я праанансую планы на найбліжэйшыя нумары. Будзе цікавая проза Алеся Бадака і Анатоля Казлова. Алесь Емяльянаў-Шыловіч пераклаў з польскай раман Тадэвуша Далэнгі-Мастовіча «Кар'ера Нікадзіма Дызмы». Мы будзем друкаваць яго часопісны варыянт. Я думаю, што імя Далэнгі-Мастовіча добра вядомае чытачам па рамане «Знахар», а адданым чытачам «Полымя» — яшчэ і па рамане «Пракурорка», які мы некалькі гадоў таму надрукавалі ўпершыню па-беларуску ў перакладзе Веранікі Бандаровіч. Акрамя таго, мы зараз вядзём перамовы, і я спадзяюся, што яны паспяхова скончацца, каб да юбілею Івана Мележа ў «Полымі» з'явіўся ўнікальны архіўны матэрыял.

— Алена Мальчэўская — не толькі рэдактар літаратурнага часопіса, але і тэатразнаўца. Калі параўноўваць працэс стварэння нумара са спектаклем, рэдактар — гэта рэжысёр?

— Гэтыя працэсы для мяне абсалютна розныя. І ніякія параўнаўчыя механізмы адносна спектакля і нумара ў маёй галаве не ўключаюцца. Мне падаецца, гэта досыць надуманая метафара. У стварэнні нумара і без параўнання з тэатрам хапае захапляльных працэсаў. Напрыклад, асэнсаванне часопіса як звыштэксту, пэўнага адзінства ўсіх яго публікацый.

— Калісьці менавіта «тоўстыя» літаратурныя часопісы стваралі пісьменнікаў-«брэнданосцаў». Сёння такія магчымасці абмежаваныя, адпаведна з падзеннем тыражоў. Расійскі крытык Галіна Юзэфовіч сур'ёзна параіла пісьменнікам «узбіваць вакол сябе пену», ствараць любога кшталту інфармацыйныя повады, каб на іх звярнулі ўвагу. Што параіць нераскручаным аўтарам галоўны рэдактар «Полымя»? І як такім трапіць на старонкі часопіса?

— Пагаджуся з Галінай Юзэфовіч. Так, трэба шукаць шляхі, каб сёння на цябе звярнулі ўвагу. Што датычыцца часопіса, то для таго, каб патрапіць на старонкі «Полымя», трэба прапанаваць свой твор рэдакцыі. А далей усё індывідуальна: нехта трапляе, некаму мы адмаўляем, некага просім дапрацаваць і г. д.

— Ці можна назваць «Полымя» «экспертным бюро», якое ставіць пячатку якасці на тое, што прынята да публікацыі? Які парытэт на старонках паміж артхаўснай літаратурай і традыцыйнай?

— Кожны літаратурны часопіс — гэта «экспертнае бюро». Але каб чытачы лепш разумелі кантэкст, прывяду такое параўнанне: часопіс — гэта лабараторыя, а кніга-выданне — шырокая вытворчасць. У нас крышку іншыя задачы, у нас арыентацыя на працэс, асэнсаванне фарміравання новых літаратурных нормаў. Што датычыцца парытэту, то крытэрыяў «традыцыйнасці» ў нас няма. Мы друкуем усё, што падаецца рэдакцыі вартым публікацыі, не зважаючы на кірункі і стылі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Свята ў хату!

ВІНШАВАННЕ ПРАЗ МЕСЕНДЖАР

У Гомелі будзе працаваць анлайн-офіс Дзеда Мароза. Прыём заявак ужо пачаўся

Незвычайны навагодні праект падрыхтавала адна з найстарэйшых установ культуры Беларусі — палац культуры «Беліцкі», што ў Гомелі.

— У сувязі з няпростай эпідэміялагічнай сітуацыяй сустрэча дзяцей з навагоднімі персанажамі значна ўскладнілася. Мы ж прапануем інавацыйны і ўнікальны фармат навагодняй індустрыі. Дзед Мароз і Снягурка ў зручны час звяжуцца па відэасувязі Viber / Telegram / Skype і ў рэжыме рэальнага часу будуць забаўляць дзетак, павіншуюць з надыходзячым святам, а таксама правядуць сапраўдны навагодні квэст на бяспечнай адлегласці, — анансуюць свой праект ва ўстанове культуры.

Арганізатары адзначаюць: галоўная ідэя праекта — стварэнне навагодняга настрою для кожнай сям'і без рызыкі для здароўя. Вядома, што офіс будзе працаваць у «сусветным маштабе».

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПАДАРУНКІ І ПАЧАСТУНКІ

«Калядны кірмаш» з 18 снежня да 14 студзеня пройдзе на дзвюх знакамітых пляцоўках сталіцы: побач з Палацам спорту і на Кастрычніцкай плошчы.

Жыхары і госці Мінска маюць магчымасць наведаць перадсвяточнае мерапрыемства.

На сайце Цэнтральнага раёна ёсць канкрэтная інфармацыя аб часе работы кірмашу. Так, на Кастрычніцкай плошчы кірмаш будзе працаваць 18—23 снежня з 12.00 да 20.00, 24—30 снежня з 12.00 да 23.00, у навагоднюю ноч — да 4.00, 2—14 студзеня з 12.00 да 20.00.

Каля Палаца спорту прапаноўваецца наступны графік: у будні — з 14.00 да 23.00, у выхадныя дні — з 12.00 да 23.00, у навагоднюю ноч — да 4.00.

На кірмашах таксама будзе наладжаны продаж пачастункаў і сувеніраў, арганізавана адпаведная культурна-забаўляльная праграма.

Увага! На тэрыторыі былога завода «Мінскдрэў» па адрасе: Кальварыйская, 21 адкрыецца кірмаш з модным фуд-кортам, дзе можна будзе паспрабаваць стравы кухняў розных народаў свету.

Леанід ТУГАРЫН.

БУДУЦЬ МАРАЗЫ — БУДУЦЬ КАТКІ

Гэтай зімой сталічныя ўлады плануюць заліць 25 каткоў і 29 хакейных каробак, правесці «Дзень снегу», «Мінскую лыжню», «Снежны снайпер», «Залатую шайбу» і іншыя мерапрыемствы на свежым паветры. Але, зразумела, з улікам уплыву пандэміі.

Як вядома, заліць каток можна пры адпаведнай мінусавой тэмпературы, ступені прамярзання глебы і мінімальна дапушчальным пласце снегу. Бо каток заліваюць паступова, пласт за пластам, да пэўнай таўшчыні льду. У Мінску лідарамі па колькасці каткоў стануць Савецкі і Цэнтральны раёны, а па хакейных каробках — Фрунзенскі і зноў Цэнтральны.

Традыцыйна ў горадзе мяркуюць наладзіць работу 16 лыжных трас агульнай працягласцю больш за 30 км. Будуць адкрытыя пункты пракату лыж і канькоў.

Леанід ТУГАРЫН.

У Магілёве пачынае работу навагодні кірмаш «Калядная крама»

Ён будзе працаваць з 5 снежня да 7 студзеня наступнага года з 10.00 да 19.00 на пляцоўцы каля гандлёвага цэнтра «Атрыум» па вуліцы Першамайскай.

Тавары навагодняй і каляднай тэматыкі будзе прапаноўваць каля пятнаццаці суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі. Акрамя сувенірнай прадукцыі, навагодніх цацак, штучных ёлак на любы густ, тут у шырокім асартыменце будуць прадстаўлены прадукцыя грамадскага харчавання, кулінарныя і кандытарскія вырабы, розныя напоі, у тым ліку чай і кава.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Таямніцы сталіцы

АДКУЛЬ У РАТУШЫ ЎЗЯЎСЯ ПРЫВІД,

або Што пакінула Мінску XVIII стагоддзе?

Каб дайсці ад ускраіны да цэнтра Мінска, у XVIII стагоддзі вам спатрэбілася б менш за дзесяць хвілін. Так, у той час горад быў невялікі, тут жыло ўсяго пяць тысяч чалавек, а да канца стагоддзя насельніцтва прырасло яшчэ на адну тысячу. Для параўнання — у Вільні тады жылі 20 тысяч, у Магілёве — 7, а ў Навагрудку — 3.

Палац Пшаздзецкіх.

На жаль, мы мала ведаем пра падзеі, якія адбываліся ў горадзе дзве сотні гадоў таму. Толькі задумайцеся: на тэрыторыі Беларусі каля 80 гадоў не было вайны — такіх мірных стагоддзяў раней яшчэ не было. І жыццё ў горадзе віравала. У ратушы пад кіраўніцтвам войта засядаў магістрат. Ён складаўся з рады і лавы. Першая займалася грамадскімі справамі, абавязкам другой быў разбор крымінальных здарэнняў. Праўда, судзіць лава магла толькі звычайных гараджан, а вось паўплываць на шляхту было цяжка. Таму ў той час і ўзнікала багата спрэчак. Шляхта набывала землі ўнутры горада, і кожны такі выкуплены кавалак тэрыторыі выпадаў з юрысдыкцыі горада. Даходзіла да сур'ёзных праблем. Калі шляхціц набываў два надзелы з розных бакоў дарогі, ён іх аб'ядноўваў і такім чынам перакрываў праезд для гараджан.

Войта прызначаў кароль. Натуральна, гэта пасада даставалася буйному шляхціцу, які часта быў гатовы ахвяраваць інтарэсамі простых мяшчан, абы не пасварыцца з больш багатымі і ўплывовымі гаспадарамі.

А яшчэ ў Мінску сядзеў ваявода, бо горад быў ваяводскім цэнтрам. Раз у два гады ў ім праходзілі трыбуналы, на якія завітвалі прадстаўнікі багатых родаў. Нескладана ўявіць, што тут разварочваліся сур'ёзныя палітычныя гульні...

Даведацца пра сталічныя таямніцы XVIII стагоддзя можна падчас аўтарскай вандроўкі экскурсавода Цімоха Акудовіча. У межах праекта «Набліжэнне» ён вучыць заўважаць дэталі, чытаць гісторыю па тых аб'ектах, якія захаваліся ў горадзе, і захапляцца ёю.

ІМПЕРАТАР, СКАРБ І «РАЗБОРКІ» МАНАХАЎ

Гэтая вандроўка пачынаецца з Кастрычніцкай плошчы. Дакладней, мы трапляем на старадаўнія Юр'еўскую (на месцы сучаснага Дома прафсаюзаў знаходзілася ўніяцкая царква Святога Юр'я) і Дамініканскую вуліцы.

Будзеце прагульвацца побач з Палацам Рэспублікі — уявіце, што тут раней стаяў адзін з самых прыгожых будынкаў горада, акружаны садам, у якім раслі прывезеныя з Еўропы грушы. Нібыта адсюль яны і распаўсюдзіліся па ўсёй Беларусі, а гатунак атрымаў назву Сапяжанка. Гэты двухпавярховы палац належаў Сапегам. Падчас Паўночнай вайны ў ім некалькі месяцаў жыў Пётр I — так расійскі імператар вырашыў пазлаваць сапернікаў. Справа ў тым, што Сапегі былі сярод тых, хто не падтрымаў усходняга суседа, а стаў на бок Карла XII. Адсюль Пётр I планаваў шэраг мерапрыемстваў. Быў у будынка яшчэ адзін важны сакрэт. Пры палацы служылі бацькі будучай імператрыцы Кацярыны Першай, пасля сужэнцы з'ехалі ў Прыбалтыку, дзе ў іх нарадзілася дачка. Выросла яна прыгажуняй і, нягледзячы на сваё не надта высокае паходжанне, змагла пакарыць Пятра Першага. Яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя будынак стаяў на Юр'еўскай вуліцы, але ў вайну ён моцна пацярпеў і яго разбурылі.

За Палацам Рэспублікі сёння стаіць шыльдачка, якая нагадвае, што пад зямлёй схаваны руіны аднаго з самых вялікіх тагачасных касцёлаў горада Мінска — Дамініканскага. Месца цяпер пустуе, і перыядычна ўсплывае пытанне пра аднаўленне на ім храма.

У старых крыніцах была занатавана інфармацыя, што храм пабудаваны на «капытовы падатак» — маўляў, калі ваяры вярталіся з вайны, дамініканцы прасілі ў іх «на Бога» ў знак падзякі за тое, што ён ўратаваў ім жыцці. З кожнага капыта каня плаціўся залаты... Ордэн быў вельмі багаты: калі манахі дабудоўвалі корпус манастыра, узялі ў арэнду цагельню для вытворчасці цэглы пад Мінскам у Петрапаўлаўскай царквы. Да XIX стагодзя хадзілі чуткі, што недзе ў падзямеллях дамініканцы схавалі скарбы (тут быў і свой падземны ход). А ў 90-я гады ўжо XX стагоддзя журналісты запісалі гісторыю, што таксісты не раз бачылі тут сабаку, які перабягае дарогу з паходняй у зубах. Здавалася б, ну што такога. Але справа ў тым, што сабака з паходняй — гэта сімвал дамініканцаў.

Дайшла са старых часоў да нас і гісторыя пра бойку паміж манахамі, якая быццам бы адбылася з-за шкаляроў, што спачатку вучыліся ў езуіцкім калегіуме, а пасля «перакінуліся» да дамініканцаў. Але пасля бойкі студэнтаў прымусілі вярнуцца на папярэдняе месца.

На той час манахі вызначалі для сябе пэўныя кірункі работы. Адны лячылі, іншыя — вучылі, займаліся друкарскай справай, дамініканцы аддавалі вялікую ўвагу тэалогіі. Адным з самых уплывовых прапаведнікаў у той час быў ксёндз Аблачынскі, на яго прамовы збіраліся натоўпы. Падчас адной з пропаведзяў, скіраванай супраць п'янства, тэолаг згадаў пра, бадай, самага злоснага парушальніка спакою гараджан, дэбашыра Міхала Валадковіча. Шляхціц пасля гэтага адпомсціў ксяндзу — падчас іншай службы заехаў у касцёл з бочкай віна, з цыганамі і мядзведзямі. Аблачынскі тады папярэдзіў, што за такі ўчынак Валадковіч абавязкова паплаціцца. Натуральна, напужаць гуляку ў ксяндза не атрымалася. Валадковічу ўсё сыходзіла з рук, бо ён лічыўся сябрам магната Пане Каханку.

Але хто б мог падумаць, якая страшная будзе расплата...

ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАРАННЕ

Брат Міхала — Юзаф Валадковіч — таксама не даваў спакою людзям. Неяк ён пасварыўся са старым суседам Яцынічам з-за зямлі. Як Яцынічу цягацца з маладым гулякам, тым больш калі ў таго такія ўплывовыя сябры? Стары шляхціц загадаў сваім слугам пакласці пасярод падворка куль саломы і малаціць яго, а сам стаў кругамі хадзіць і пытацца: «Каго б'яце?» А слугі адказвалі, што пана Валадковіча. Праз нейкі час малады сусед запрасіў Яцынічa быццам мірыцца, але загадаў слугам схапіць «госця» і біць на падворку, а на пытанне «Каго б'яце?» адказваць: «Куль саломы»...

Канешне, стары шляхціц сцярпець такой крыўды не мог. Ён звяртаўся ў суд, праходзіў розныя інстанцыі, яму нават удалося дабіцца, каб Валадковіч сплаціў штраф і адправіўся на дамашні арышт у манастыр на некалькі месяцаў. Толькі пакаранне тое было занадта мяккае — у манастыры, на які раней яго род ахвяраваў грошы, Валадковіч гуляў са сваёй світай. Урэшце стары шляхціц звярнуўся ў трыбунал, і тут пачаліся гульні эліты. Чартарыйскія, жадаючы насаліць Радзівілу, настаялі на прызнанні Валадковіча вінаватым. На пасяджэнні прысутнічаў і брат Юзафа — Міхал Валадковіч. Абураны рашэннем, ён выхапіў шаблю, напаў на ўдзельнікаў трыбунала і нават выпадкова рассёк распяцце. А пасля гэтага сустрэў у радзе пахавальную працэсію, развярнуў яе, шумеў, напіўся... Чартарыйскія вырашылі скарыстаць такую магчымасць, каб яшчэ больш зачапіць Радзівілаў — звярнуліся ў Вільню за дазволам на сур'ёзнае пакаранне.

Такім скульптары ўявілі войта.

Сябры данеслі Валадковічу, што яго збіраюцца забіць. Толькі той не паверыў. Але Міхала пакаралі. І пасля гэтага пачала хадзіць пагалоска, што ў ратушы блукае прывід пана Валадковіча. Гэта адна з самых трагічных гісторый таго часу — упершыню шляхціца пакаралі смерцю — без споведзі — і здавалася б, за што? За п'янства і нястрымны нораў? Невыпадкова мемуарысты канца XVIII—пачатку XIX стагоддзя так часта да яе звярталіся, яна запісана ў некалькіх варыяцыях.

ІНФРАСТРУКТУРА

Трыбуналы — найвялікшы суд Вялікага Княства Літоўскага — адбываліся на замку. Тут вырашаліся справы, якія датычыліся тэрыторыі ўсходняй і цэнтральнай Беларусі. Пасяджэнні зацягваліся на некалькі месяцаў, а значыць, усіх гасцей, што сюды прыязджалі, трэба было забяспечыць жытлом і відовішчамі. Магнаты будавалі сабе дамы, каб было дзе прыпыніцца. Так Радзівілы ўзвялі палац, які стаяў на месцы сучаснай гасцініцы «Еўропа».

А яшчэ важнай падзеяй для ваяводскага горада былі соймікі, куды з'язджалася шляхта. Натуральна, яна не толькі вырашала сур'ёзныя пытанні, але і старалася весела бавіць час.

Магчыма, ужо ў XVIII стагоддзі ў Мінску з'явіліся першыя кавярні, ва ўсякім разе модны ў Еўропе напой быў ва ўсіх заможных дамах, некаторыя нават трымалі асобную работніцу, якая заварвала каву. А вось чай на беларускія землі прыйшоў толькі ў XIX стагоддзі.

Наогул, XVIII стагоддзе — час сур'ёзных зрухаў ва ўсіх галінах: навуковыя адкрыцці, новая музыка, танцы, мода. Калі ў Еўропе змены адбываліся павольна, то на нашых землях доўга затрымлівалася барока. Мужчыны, якія прытрымліваліся сармацкага стылю, доўга не хацелі прымаць еўрапейскую моду з парыкамі і ласінамі. Жанчыны былі больш гнуткія, яны хутка спасцігалі сакрэты еўрапейскіх прыгажунь. У пачатку XVIII стагоддзя яны пазбавіліся ад рэчаў чорнага колеру, што быў папулярны ў папярэднім стагоддзі, іх вопратка стала больш адкрытая. Ускладніўся этыкет, на сталах дадалося сталовых прыбораў.

Вялікая ўвага аддавалася адукацыі. Справа і злева ад касцёла Дзевы Марыі (сёння гэта Плошча Свабоды) размяшчаліся езуіцкі калегіум і школа. Менавіта тут прымяняліся новыя методыкі навучання. Лічыцца, што езуіты прыдумалі класна-ўрочную сістэму, а таксама розныя прыёмы стымуляцыі навучання, першыя рашылі, што дзецям неабходна выкладаць фізкультуру. Езуітам у Мінску належаў цэлы квартал, можна было б нават рабіць асобны музей, які быў бы прысвечаны гэтаму ордэну.

На Плошчы Свабоды захаваўся яшчэ адзін са старых будынкаў — палац Пшаздзецкіх. Сёння там адкрыта мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага. Антоній Пшаздзецкі быў з сярэдняй шляхты. Яму ўдалося выбудаваць неблагую кар'еру, а ўсё таму, што ён зрабіў стаўку на князёў Чартарыйскіх і быў шчодра ўзнагароджаны за службу.

У XVIII стагоддзі горад яшчэ быў шчыльна забудаваны драўлянымі дамкамі, таму ён моцна цярпеў ад пажараў. Але існавала жорсткае правіла: калі дом згарэў, гаспадар на яго месцы павінен быў паставіць цагляную пабудову, інакш яго маглі пагнаць з горада. Таму ў XIX стагоддзі Мінск пачаў мяняць сваё аблічча.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Гэты куток сучаснага Мінска вяртае нас у XVIII стагоддзе.

Вітаўт ЧАРОПКА:

«МОЙ АБАВЯЗАК — ВЯРНУЦЬ БЕЛАРУСАМ ІМЁНЫ ІХ СЛАЎНЫХ ПРОДКАЎ»

Пастаянная рубрыка «Ігуменскага тракта», якую вёў вядомы пісьменнік Вітаўт Чаропка, сышла ў больш шырокую прастору — віртуальную. Цяпер на партале Выдавецкага дома «Звязда» дзейнічае рубрыка «Пантэон вялікіх беларусаў» — цыкл гістарычных эсэ Вітаўта Чаропкі. Адзін з артыкулаў пра яго называўся «Калумб сівой даўніны». І сапраўды, шмат у чым даследчыку давялося быць першым, асэнсоўваючы старонкі беларускай гісторыі, папулярызуючы яе незаслужана забытых персанажаў. Чытайце разважанні слыннага нашага аўтара ў гэтым інтэрв'ю і завітвайце на наш сайт, каб зазірнуць у «Пантэон» — сапраўдную хрэстаматыю беларускага мінулага. Там вы зможаце ў даступнай, займальнай форме, у суправаджэнні выяў сустрэцца з князямі і філосафамі, друкарамі і паэтамі, вайскаводцамі і навукоўцамі нашай зямлі, даведацца незвычайныя факты пра іх.

nastgaz.by

— Пра колькі постацяў ты ўжо напісаў і ці лёгка «знаходзіць» новыя? Якімі крыніцамі карыстаешся?

— Пэўна, за сотню будзе. Калі пішу пра гістарычную постаць, дык імкнуся выкарыстаць усе даступныя крыніцы. Вельмі каштоўным матэрыялам з'яўляецца эпісталярная спадчына. Удаецца зазірнуць чалавеку ў душу, зразумець яго пачуцці і матывы. Усялякі раз, калі заканчваеш пісаць нарыс пра чарговага героя, адчуваеш сум, нібыта развітваешся з добрым сябрам, бо за доўгі час ён становіцца табе блізкі і дарагі. Нават робіцца сорамна за нейкія яго паводзіны ці ўчынкі, хочацца ў іх разабрацца і апраўдаць яго. Гэта, вядома ж, суб'ектывізм, але куды ад яго дзецца, калі ты пішаш пра чалавека, хай нават і вялікага.

— Сярод персаналій тваіх артыкулаў не толькі тыя, каго можна падвесці пад азначэнне «этнічны беларус», і не толькі адназначна станоўчыя героі. Пытанне, якое выклікае шмат спрэчак: хто варты быць занесены ў нацыянальны пантэон? Якімі крытэрыямі ты кіруешся? Ці здаралася, што рашэнне прадставіць кагосьці як беларускага героя выклікала супраціў?

— Для мяне і крывіцкія князі (як іх называе «Аповесць мінулых гадоў»), і вялікія князі літоўскія, і «літвіны» Радзівілы, і «русіны» Сапегі — прадстаўнікі нашай, беларускай, гісторыі. Важна не этнічнае паходжанне той ці іншай асобы, а тое, што яна зрабіла для нашай зямлі, якую мы цяпер называем Беларусь. Вось я і расказваю сціпла і дасціпна пра гэта. І ў «Пантэоне» прадстаўлены людзі рознага этнічнага паходжання, напрыклад татарскага — Якуб Ясінскі і Напалеон Орда, ці нямецкага — Антоні Тызенгаўз, Эмілія Плятар. Гэтыя людзі ўпісалі свае імёны ў нашу гісторыю і культуру. Можна пашкадаваць, што не пра ўсіх вартых удалося расказаць. Канешне, ёсць асобы, якія выклікаюць унутраны супраціў, напрыклад Жыгімонт Аўгуст. Але мне яго шкада як няшчаснага чалавека з даволі драматычным лёсам. Зрэшты, ён імпануе тым, што ўмеў шукаць кампраміс — адна з галоўных якасцяў уладара. Ён быў аматарам мастацтва і гуманістам і не дапусціў рэлігійнай і палітычнай варажнечы, як у Францыі ці пазней у Германіі.

— Пятро Васючэнка напісаў эсэ пра «беларускую здраду» — маўляў, у гісторыі паводзінамі беларусаў часта расчароўваліся іх часовыя саюзнікі, вінавацячы ў «здрадзе». А сутнасць у тым, што беларусы павінны быць верныя ўласным інтарэсам, у чым ім адмаўляюць. Ці можа існаваць «аб'ектыўная гісторыя», ці ўсё-ткі кожны народ мусіць ацэньваць падзеі з пункту гледжання ўласных нацыянальных інтарэсаў? Як прыклад — у кнізе пра Уленшпігеля Шарля дэ Кастэра іспанцы паказаныя адмоўна, у раманах Жуля Верна дэманізуюцца англічане-каланізатары, насуперак «прагрэсіўным французам», Фенімор Купер, наадварот, паказваў добрых англічан, якія хаўрусуюць з індзейцамі, і кепскіх французаў... І гэтак далей.

— Гэта аксіёма, што кожны народ клапоціцца перш за ўсё пра сябе і свае інтарэсы. Чым закончылася «братерская любоў» палякаў да літвінаў? Рабаўніцкай Люблінскай уніяй, калі Польскае Каралеўства прысвоіла сабе палову Вялікага Княства Літоўскага. Вось тут мы і бачым, як гэтую падзею ацэньваюць у Польшчы і як мы. Для польскіх гісторыкаў — гэта трыумф польскай палітыкі і г. д., а для нас — драма, якая звяла дзяржаву нашых продкаў да другараднай ролі ў Рэчы Паспалітай. І дзе тут аб'ектыўнасць? Хто вызначыць яе? Магчыма, правільна, што гісторык мусіць быць перш за ўсё патрыётам, а пасля навукоўцам. Гэта натуральныя праяўленні чалавечых пачуццяў. Я згодны з тваімі прыкладамі. Нашы сэрцы заўсёды на баку герояў, якія змагаюцца за свабоду народа і роднага краю.

— Што мае большае значэнне: мастацкія творы на гістарычныя тэмы ці дакументальныя даследаванні? Наколькі вырашальная між імі мяжа, наколькі можна дапусціць у мастацкім творы скажэнне фактаў, а ў артыкуле — эмацыянальную афарбоўку?

— Важна і тое, і тое. Мастацкі твор можа захапляльна і вобразна расказаць аб мінулым і стварыць яго прывабную карціну. Часта наша ўяўленне аб гістарычных падзеях якраз і грунтуецца на мастацкіх творах. Але аснова любога гістарычнага твора — гэта перш за ўсё навуковае даследаванне гісторыкаў — яны падаюць факты, прыводзяць дакументы, робяць высновы. Некаторыя гістарычныя даследаванні чытаеш, як захапляльны дэтэктыў. Не толькі змяняеш свае старыя погляды на тую ці іншую гістарычную падзею ці асобу, але і па-новаму спрабуеш яе асэнсаваць. Імпануе, калі даследчык думае, аналізуе і праяўляе шырокую эрудыцыю, і тады не залішнімі здаюцца маленькія лірычныя адступленні, удалыя параўнанні і метафары. Думаю, не грэх даволі вольна трактаваць гістарычныя факты ў мастацкім творы. Калі гэтага вымагае раскрыццё вобраза ці сюжэт, дык чаму не? Твор можа толькі выйграць. Успамінаецца вядомы прынцып Аляксандра Дзюма, для якога гісторыя — гэта «цвік», на які ён «вешаў» свае сюжэты. І класічны прыклад: «Вайна і мір» Льва Талстога. Колькі яго дакаралі за недакладнасці, за скажэнне фактаў, а вось пра вайну 1812 года мы якраз і ведаем з яго вялікага твора.

— Гендарнае пытанне... Як шмат у гісторыі застаецца жаночых імёнаў, у прыватнасці ў гісторыі Беларусі, і якімі шляхамі жанчыны траплялі ў гісторыю?

— Нашай гісторыі ўсё ж пашчасціла на славутых жанчын, нагадаем Рагнеду, Ефрасінню Полацкую, Соф'ю Гальшанскую, Ганну Святаслаўну, Марыю Віцебскую, Ульяну Цвярскую, Анастасію Слуцкую, Соф'ю Слуцкую, Барбару Радзівіл, Эмілію Плятэр, дзеячак беларускага адраджэння Палуту Бадунову, Канстанцыю Буйло, Цётку ці драматычны лёс Ларысы Геніюш. Не кажу ўжо пра суквецце нашых цудоўных паэтак, мастачак, артыстак, спартсменак.

— У адной з нашых гутарак ты сцвярджаў, што не гісторык і не пісьменнік... А ты ж яшчэ і карціны ўзяўся пісаць. Ці працягваеш і на якія тэмы?

— Так, «Двух станов не боец, а только гость случайный». Пісьменнікі лічаць мяне гісторыкам, а гісторыкі — пісьменнікам. Становішча натуральнае, калі працуеш на памежжы розных жанраў. Сам я вызначаю жанр сваіх біяграфічных штудый, як літаратурна-гістарычныя нарысы. Але яны толькі частка маёй творчасці, хай і значная. Проста я лічу, што мой абавязак вярнуць беларусам імёны іх слаўных продкаў, каб іх сузор'е зіхацела над Беларуссю. А ў творчасці мне падабаецца звяртацца да новага, таму захапляўся і постмадэрнізмам, і містыкай, і гісторыяй, і фэнтэзі, і прыгодамі, авантурамі. Усяго патроху, не хочацца паўтарацца і тыражаваць сябе. Калі твая творчасць не для твайго матэрыяльнага забеспячэння, дык мусіць прыносіць духоўную, эстэтычную асалоду. Вось тут вельмі і прыдаўся жывапіс. Гэта чароўна, калі пад тваёй рукой нараджаецца маляўнічы твор, ты можаш убачыць вынік свайго натхнення і працы, а не чакаць месяцы, а то і гады, калі надрукуюць твой чарговы опус. Гэта сапраўды захапляльна! У мастацтве творчы працэс больш інтэнсіўны і нават эмацыянальны. Ды ўвогуле, нас акаляе шэры свет, мала сонца, а я ствараю свой свет з фарбаў, шматколерны і дзівосны, і ад гэтага на душы робіцца светла. Сваім святлом дзялюся з іншымі — дару ім свае работы. Офіс «Беларускага гістарычнага часопіса», дзе я працую, абвешаў карцінамі, так што там у нас пастаянны вернісаж.

— У якім са сваіх герояў ты найбольш расчараваўся? А ці былі адваротныя выпадкі?

— У сваіх героях я не расчароўваўся, бо яны ўсе вельмі годныя асобы, хоць і не ідэальныя. Я думаю, пра людзей трэба пісаць добрае і светлае, неяк мы забыліся казаць добрае слова пра сваіх сяброў, знаёмых, калег, сабратаў на пяры. А калі я ў кім і расчараваўся, дык у самім сябе. Мог зрабіць больш і лепш, а дзесьці паленаваўся, не сабраўся, адклаў на заўтра, а ў выніку не зрабіў тое, што мог і мусіў зрабіць паводле свайго прызвання.

— Калі складаць вобраз архетыповага беларуса, рысы якіх гістарычных персанажаў ты б яму надаў?

— Няпроста адказаць. Часам тыповы беларус мне нагадвае купалаўскага Зносака з «Тутэйшых» з яго філасофіяй прыстасаванца ці Мележаўскага Дзятліка, для якога зямля клінам сышлася на яго дзялянцы, і далей ён нічога не бачыць. Думаю, сучасным беларусам не хапае высакароднасці і самаахвярнасці Каліноўскага, падвіжніцтва Скарыны і, на жаль, здаровай нацыянальнай годнасці. Трэба навучыцца не толькі паважаць саміх сябе, але і любіць. Вось-вось, нам не хапае свайго, беларускага, эгаізму. Мы — гэта мы! Мы моцныя і мы пераможам. Любога, таму што мы беларусы!

— Ці была мара ўмяшацца ў нейкія гістарычныя падзеі, пра якія пісаў? У якую эпоху адправіўся б? Што менавіта зрабіў бы?

— Гэта з вобласці фэнтэзі. Адзінае, што хацелася неяк, зазірнуць у эпоху Полацкага княства і пачаткаў Вялікага Княства Літоўскага. Там, сапраўды, трылер і дэтэктыў, што да чаго, хто, калі і як — з-за недастатковасці крыніц малавядома, але вельмі цікава. Вось каб адшукаўся нейкі летапіс з той эпохі — гэта было б сапраўдным адкрыццём старажытнай Беларусі. А так даводзіцца гадаць ды гарадзіць усялякія версіі.

— Традыцыйна-банальнае: што ў планах? А што ў марах?

— Планы канкрэтныя: выдаць тое, што напісаў. Цяпер вось працую над серыяй кніг пра вялікіх князёў літоўскіх. Яны багата ілюстраваныя, напісаныя спецыяльна на рускай мове для шырокага кола чытачоў. У выдавецтве «Адукацыя і выхаванне» выйшла ўжо пяць кніг з гэтай серыі. Праект, як лічу, апраўдвае сябе, бо годна прадстаўляе нашую гісторыю. Напрыклад, толькі на адным з расійскіх сайтаў было 90 тысяч спампоўванняў кнігі «Витовт». Так што я цяпер з галавой у гэтым праекце. А наконт мар, дык яна адна — каб у Беларусі ўсё было добра!

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Нагадаем для нашых чытачоў, што адрас рубрыкі «Пантэон вялікіх беларусаў» — http://zviazda.by/be/project/panteon-aychyny. Там багата дапаможнага матэрыялу для школьнікаў, студэнтаў, настаўнікаў і шмат цікавага для ўсіх аматараў гісторыі. Рубрыка рэгулярна папаўняецца.

Пункт на карце

САМ САБЕ ЭКСКУРСАВОД

Сярэдняя школа № 6 горада Кобрына сумесна з мясцовым аддзелам культуры райвыканкама працуе над праектам турыстычнага гіда і даведніка. Акрамя таго, новы інфармацыйны прадукт утрымлівае звесткі энцыклапедычнага характару аб мясцовых адметных мясцінах і славутасцях.

Цікавасць да гісторыі і сакрэтаў невялікіх гарадоў з кожным годам расце. І справа не толькі ў тым, што людзям падабаецца адкрываць для сябе новыя маршруты. Часам мы проста хочам збегчы ад сталічнай мітусні і паспрабаваць ператварыцца хоць бы на дзень у адкрывальнікаў невядомых нам раней куткоў Радзімы. Сёння, калі пандэмія «замыкае» нас у межах краіны, самы час больш увагі надаць вывучэнню ўласных гісторыі і культуры.

Але, на жаль, на месцах пакуль яшчэ не хапае прафесійных экскурсаводаў, даволі часта многія аб'екты не адзначаны на карце і не апісаны. Таму сёння асаблівую ролю набываюць аўдыягіды, якія дазваляюць турысту падарожнічаць самастойна.

Праект «Пазнай Кобрын» (https://kobrintour.by) будзе карысны для тых, хто хоча больш даведацца пра гэты горад і раён. Выкарыстоўваючы інтэрактыўную карту з нанесенымі на яе аб'ектамі (помнікі, архітэктура, музеі, паркі, скверы, месцы пахаванняў, прыродныя аб'екты), можна дабрацца да ўсіх цікавых месцаў. З дапамогай геалакацыі пракладваць свае маршруты і знаходзіць аб'екты, якія хацелася б наведаць.

У аснове праекта — уласная распрацоўка платформы «Planet Guide», якая адкрывае турыстам доступ да інфармацыі аб самых важных аб'ектах рэгіёна.

Прадумана тут і актуальная ў часы каранавіруса форма пазнання — віртуальная экскурсія па Кобрыне. 3D-тур правядзе па галоўных вуліцах горада, праз сквер на Плошчы Леніна да Палаца культуры і сядзібы Суворава. І нават па мясцовым музеі можна пагуляць віртуальна.

А чаму б не зазірнуць у 80-я гады — унікальныя фатаграфіі з падрабязным апісаннем нагадаюць пра атмасферу таго часу, дазволяць прасачыць змены, які адбыліся ў гарадской прасторы.

Прадукт адаптаваны пад усе сучасныя гаджэты. Дзякуючы праекту «Пазнай Кобрын» з усімі яго інструментамі (інтэрактыўная карта, QR-коды, аўдыягід) любы ахвотны можа вывучаць цікавінкі горада. Натуральна, кішэнны аўдыягід будзе карысны не толькі для гасцей горада, але і для мясцовых дзяцей і моладзі, людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-93864 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – здание школы), общей площадью 192,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 1.
Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422087505601000093, площадью 0,0804 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания школы), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 1. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок , расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2 площадью 0,0031 га; земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1 площадью 0,0804 га.
Начальная цена продажи лота – 32,40 руб. (тридцать два рубля сорок копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 3,24 руб. (три рубля двадцать четыре копейки)

